Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

23 (7339) | Нядзеля, 4 лютага 1945 г. | Цана 20 кап.

Чырвоная Армія штурмуе фашысцкае логава

Наступленне Чырвонай Арміі бліскуча развіваецца. Кожны дзень загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна адзначаюць новыя бліскучыя перамогі Чырвонай Арміі. На велізарным фронце ад Балтыйскага мора да Карпацкіх гор імкліва прасоўваюцца ўперад нашы слаўныя воіны.

Пераможны гром совецкіх гармат грыміць у Заходняй Польшчы, у Чэхаславакіі, у Венгрыі. Совецкія войскі паспяхова штурмуюць логава фашысцкага звера. Чырвоная Армія адрэзала Усходнюю Прусію ад астатняй Германіі, уторглася ў Верхнюю Сілезію, у Памеранію, у Брандэнбургскую правінцыю. Нашы войскі знаходзяцца на подступах да Франкфурта на Одэры. Совецкія войскі ўварваліся ў логава фашысцкага звера на поўначы, на поўдні і на цэнтральным участку фронта.

Ламаючы шалёнае супраціўленне ворага, змятаючы з твару зямлі пабудаваныя ім па апошняму слову тэхнікі ўмацаванні, Чырвоная Армія няўхільна ідзе да Берліна, каб узняць над ім сцяг перамогі, каб назаўсёды знішчыць фашысцкую Германію. Чырвоная Армія штурмуе бярлогу фашысцкага звера з розных бакоў на шырокім фронце...

Нялёгкі шлях Чырвонай Арміі. Вораг прымае ўсе захады, каб стрымаць наш напіск. Ён прыбягае да контратак. Ён перакідвае з заходняга фронта і з глыбіні Германіі танкавыя і пяхотныя дывізіі. Гітлераўцы супраціўляюцца з адчаем асуджаных на пагібель. Але дарэмна. Нічога не выратуе фашысцкіх забойцаў ад поўнага разгрому.

Арганізаванасць Чырвонай Арміі, ваеннае майстэрства, памножанае на масавы гераізм, наступальны парыў нашых воінаў, усведамлённе сваёй вялікай гераічнай місіі—спалучэнне ўсіх гэтых акалічнасцей ламае ўсякія перашкоды. Няма такіх крэпасцей, якіх не магла-б узяць Чырвоная Армія пад мудрым кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

Чырвоная Армія наносіць нямецка-фашысцкай арміі непапаўнімыя страты. Як аб гэтым паведамляла Совецкае Інформбюро, толькі з 12 па 24 студзеня ў выніку наступальных баёў пяці франтоў страты праціўніка па асноўных відах баявой тэхнікі і жывой сіле складалі: палонных і забітымі больш 380 тысяч, самалётаў—592, танкаў і самаходных гармат—2995, гармат—7.932, мінамётаў—7.386, кулямётаў—26.019, аўтамашын—34.019.

Страты праціўніка растуць з кожным днём. Нашы войскі імкліва наступаюць і наносяць гітлераўцам удар за ўдарам.

Каб прадставіць сабе тэмпы, імклівасць наступлення нашых войск, дастаткова сказаць, што толькі за тры тыдні наступлення войскі 1-га Беларускага фронта прайшлі на захад больш 350 кілометраў. У ходзе наступлення нашы войскі занялі больш 7.000 нямецкіх гарадоў і населеных пунктаў.

Ні адна армія ў свеце не ведала яшчэ такога гіганцкага наступлення, гіганцкага па сваёй сіле, імклівасці, маштабах, па сваіх бліскучых выніках. Нашы слаўныя воіны адкрылі новую главу ў гісторыі ваеннай справы. Гістарычныя перамогі Чырвонай Арміі сталі магчымы таму, што наша армія дзейнічала і дзейнічае так, як вучыць, як патрабуе ад нашых войск геніяльны ваенны стратэг таварыш Сталін. Бліскучае наступленне Чырвонай Арміі гэта сталінскае ваеннае майстэрства ў дзеянні. Перамогі Чырвонай Арміі забяспечаны гераічнымі намаганнямі ўсяго совецкага народа, самаадданай работай дзесяткаў мільёнаў совецкіх патрыётаў у тылу, якія забяспечваюць Чырвоную Армію першакласным узбраеннем, боепрыпасамі, прадавольствам і ўсім неабходным для перамогі.

Выдатныя поспехі Чырвонай Арміі натхняюць сыноў і дочак беларускага народа, як і ўсіх совецкіх людзей, на новыя подвігі на фронце і ў тылу.

У нашых радах няма і не павінна быць самасупакоенасці. Барацьба прадаўжаецца. У самыя цяжкія для Радзімы дні, калі над нашай соцыялістычнай краінай навісла страшэнная небяспека, калі фашысцкі звер лютаваў на нашай зямлі, совецкія людзі верылі ў немінучасць нашай перамогі і гераічна змагаліся за яе набліжэнне. Тым больш моцна наша вера ў блізкую перамогу цяпер. Совецкая зямля поўнасцю вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Чырвоная Армія б'е ворага на яго ўласнай тэрыторыі. Толькі каля сотні кілометраў аддзяляюць Чырвоную Армію ад Берліна. Але мы памятаем мудрыя ўказанні таварыша Сталіна, што перамога не прыходзіць сама. Яе трэба заваяваць. Гітлераўскія галаварэзы самі ў пятлю не палезуць. Фашысцкіх нягоднікаў трэба падвесці да бяздоння і спіхнуць іх туды. І таму мы павінны яшчэ больш узмацніць дапамогу Чырвонай Арміі, падвоіць, патроіць нашы намаганні ў барацьбе за аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі.

Усе сілы на дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі! Наблізім дзень нашай поўнай перамогі, дзень расплаты. За ўсе пакуты, гора і слёзы нашых людзей, за масавае забойства совецкіх людзей, за руіны,—за ўсе крывавыя злачынствы поўнасцю адкажуць гітлераўскія нягоднікі.

У фашысцкай Германіі паніка, разгубленасць, страх перад немінучай катастрофай, якая набліжаецца. Бягуць фашысцкія гады з Берліна, бягуць у Мюнхен, у другія нямецкія гарады. Але гэта іх не выратуе. Бягуць дзетазабойцы, бягуць падпальшчыкі, грабіцелі. Паніка ў Берліне. Мільёны бежанцаў ствараюць заторы на транспарце, паязды бяруцца прыступам, дарогі забіты бежанцамі. Няхай-жа трапеча ў жывёльным страху фашысцкае звяр'ё. Няхай патокамі сваёй бруднай крыві расплоцяцца гітлераўскія бандыты.

Слава нашай гераічнай Чырвонай Арміі!

Смерць нямецкім захопнікам!

МІНСК.

Старшыні Соўнаркома Беларускай ССР таварышу ПАНАМАРЭНКА

Мы, старацелі арцелі «Гарняк», Кербінскага прыска, «Прыморзолата», заслухаўшы пісьмы, атрыманыя членамі арцелі ад родных і блізкіх аб зверствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі, да глыбіні душы абураны крывавымі зладзеяннямі нямецкіх катаў. Няма слоў, каб выказаць наша абурэнне, і няма слоў для выражэння нашай гордасці за Чырвоную Армію, якая вызваліла народ ад фашысцкіх варвараў.

У мэтах найхутчэйшага вылячэння цяжкіх ран, нанесеных гітлераўцамі беларускаму народу, мы ўнеслі ў Осіпенкаўскае аддзяленне Дзяржбанка, Ніжне-Амурскай вобласці, 10.000 рублёў на аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі.

Просім прыняць наш старацельскі ўклад у агульную справу перамогі.

Па даручэнню арцелі

Старшыня праўлення арцелі БІНДЗР.

МІНСК.

Старшыні СНК БССР тав. ПАНАМАРЭНКА Сакратару ЦК КП(б)Б тав. КІСЯЛЁВУ

Студзеньскі план першага месяца работы пасля аднаўлення Валкавыскім цэментным заводам выканан на 150 процантаў. Калектыў завода запэўнівае Совет Народных Камісараў і Цэнтральны Камітэт партыі, што прыкладзе ўсё ўменне на датэрміновае выкананне лютаўскага плана.

Дырэктар завода ВЕСЯЛОЎ.
Парторг ЗУБАРАЎ.

Абед у Старшыні Совета Саюза А. А. АНДРЭЕВА і Старшыні Совета Нацыянальнасцей Н. М. ШВЕРНІКА

1 лютага Старшыня Совета Саюза А. А. Андрэеў і Старшыня Совета Нацыянальнасцей Н. М. Швернік далі абед у чэсць Дэлегацыі Англійскага Парламента.

На абедзе прысутнічалі п. п. В. Эліот, глава дэлегацыі, Ч. Пансонбі, М. Балер, Д. Паркер, Томас Фрэзер, лорд Фарынгдон, І. Робертс, П. В. Джэусон, С. Кінг-Хол і прадстаўнікі Брытанскага Пасольства. З совецкага боку прысутнічалі А. І. Мікаян, А. І. Шахурын, В. А. Малышэў, В. Г. Дзеканозаў, С. А. Лазоўскі, А. Ф. Горкін, В. А. Сергееў, І. П. Бардзін, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, Г. М. Папоў, І. А. Власаў, П. Д. Лысенка, В. Н. Абразцоў, М. В. Сарычэва, М. Э. Чыаурэлі і другія дэпутаты абодвух Палат Вярхоўнага Совета СССР, а таксама адказныя супрацоўнікі Народнага Камісарыята Замежных Спраў СССР.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 2 ЛЮТАГА

На працягу 2 лютага ва Усходняй Прусіі нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, авалодалі гарадамі ДАМНАУ, ШЫПЕНБАЙЛЬ, ГУТШТАДТ, а таксама з баямі занялі больш 100 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты ГЕРМАУ, РАМІТЭН, ШЭНБРУХ, ЛАНГЕНДОРФ, ЛЯНДСКРОН, ЮДЗІТЭН, ЛІСКЕН, ТРАМІТЭН, РЭДЗЕНАУ, ПЕТЭРСХАГЕН, ЗЮСЕНБЕРГ, ШТОЛЬЦХАГЕН, АЛЬТКІРХ, БАЛЬЦВАЛЬДЭ, ЛАУТЭРВАЛЬДЭ.

У раёне ШНАЙДЭМЮЛЬ нашы войскі вялі баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка.

На паўночным усходзе і ўсходзе ад ФРАНКФУРТА на ОДЭРЫ нашы войскі з боем авалодалі гарадамі ЗОЛЬДЗІН, ДРОСЕН, а таксама занялі больш 150 другіх населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты ШТАФЕЛЬДЭ, АЛЬТ, ЛІМРЫТЦ, РАДАХ, МАЛЬСАЎ, ВАЛЬВІТЦ.

У раёне Пазнані прадаўжаліся баі па знішчэнню акружаных у горадзе часцей праціўніка.

На захадзе ад горада ЛЕШНО (ЛІСА) нашы войскі выйшлі да ракі ОДЭР, заняўшы пры гэтым буйныя населеныя пункты КОЛЬЦЫГ, КАНТОП, ЛІБЕНЦЫГ, БОЙАДЭЛЬ, ПІРНІХ, ЛІПЕН.

У БУДАПЕШЦЕ нашы войскі, прадаўжаючы баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка ў заходняй частцы горада (БУДА), занялі 23 кварталы.

За 1 лютага на ўсіх франтах падбіта і знішчана 133 нямецкія танкі. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 26 самалётаў праціўніка.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 3 ЛЮТАГА

На працягу 3 лютага ва УСХОДНЯЙ ПРУСІІ нашы войскі прадаўжалі весці наступальныя баі, у ходзе якіх занялі больш 30 населеных пунктаў і сярод іх ШПІТЭНЕН, АЙХОРН, ХАУСХАГЕН, РАЙХЕНБЕРГ, ПЕТЭРСВАЛЬДЭ, ГРОНА, ЗОМЕРФЕЛЬД.

На паўночным захадзе і захадзе ад горада ШНАЙДЭМЮЛЬ нашы войскі з боем авалодалі гарадамі ФРОЙДЭНФІР, ШЛОПЕ, а таксама занялі больш 40 другіх населеных пунктаў, у тым ліку ЯГДХАУЗ, КЛАВІТЭРСДОРФ, ЗАГЕМЮЛЬ, КВІРЫМ, КАРЛЬСРУЭ, АРНСФЕЛЬДЭ, РУШЭНДОРФ, МЕЛЕНТЫН.

На паўночным усходзе і ўсходзе ад ФРАНКФУРТА на ОДЭРЫ нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, авалодалі гарадамі ВІТЦ, ЗОНЕНБУРГ, ЦЫЛЕНЦЫГ, РЭПЕН, ШТЭРНБЕРГ, а таксама з баямі занялі больш 150 другіх населеных пунктаў. На паўднёвым усходзе ад КЮСТРЫНА нашы войскі акружылі ў лясах значную групу нямецкіх войск і пасля ўпорнага бою поўнасцю разграмілі яе, захапіўшы пры гэтым наступныя трафеі: гармат — 163, мінамётаў — 55, кулямётаў — 167, аўтамашын — 1.626, матацыклаў — 500, падвод з ваеннымі грузамі — 200. Узята ў палон 9.450 нямецкіх салдат і афіцэраў. На полі бою асталося больш 8.000 трупаў нямецкіх салдат і афіцэраў.

У БУДАПЕШЦЕ прадаўжаліся баі па знішчэнню гарнізона праціўніка, акружанага ў заходняй частцы горада (БУДА), у ходзе якіх нашы войскі занялі 10 кварталаў.

На ўсходзе і паўднёвым усходзе ад горада СЕКЕШФЕХЕРВАР нашы войскі, у выніку прадпрынятых атак, прасунуліся ўперад да 20 кілометраў, заняўшы пры гэтым больш 60 населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты КІШВЕЛЭНЦЭ, ГАРДОНЬ, АДОНІ-САБОЛЧ, ПЕРКАТА, ХЕРЦЭГФАЛЬВА, ШАРБОГАРД.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 2 лютага на ўсіх франтах падбіта і знішчана 176 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіт 21 самалёт праціўніка.

* * *

Ва Ўсходняй Прусіі нашы войскі прадаўжалі наступленне. Часці Н-скага злучэння ў ходзе жорсткіх баёў зламалі супраціўленне немцаў, якія заселі ў жалезабетонных дотах, і занялі населены пункт Шпітэнен, што знаходзіцца ў 3 кілометрах на захадзе ад горада Бартэнштайн. Другія нашы часці прасунуліся ўперад да 15 кілометраў і вядуць баі на подступах да горада Лансберг—важнага вузла шасейных дарог. У гэтых баях немцы страцілі толькі забітымі да 6.000 салдат і афіцэраў. Знішчана 68 танкаў і самаходных гармат, 33 бронетранспарцёры і 50 палявых гармат. Усюды валяецца разбітая тэхніка і ўзбраенне, кінутыя гітлераўцамі. Захоплены трафеі, у ліку якіх 25 паравозаў, 500 чыгуначных вагонаў, 69 цягачоў і 470 аўтамашын. Узята ў палон 700 салдат і афіцэраў праціўніка. Совецкія воіны праяўляюць мужнасць і адвагу ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі. Бронебойшчык Міхаіл Гарачоў, адбіваючы варожую контратаку, падпаліў 2 нямецкія танкі. Экіпаж самаходнай гарматы лейтэнанта Катаруша, падтрымліваючы наступленне пяхоты, знішчыў у адным баі 4 нямецкія кулямёты, адну гармату, бронетранспарцёр і знішчыў некалькі дзесяткаў гітлераўцаў. Байцы стралковага аддзялення на чале з сержантам Блізнюк у рукапашнай схватцы знішчылі 20 немцаў і ўзялі 7 палонных.

* * *

На паўночным захадзе і захадзе ад горада Шнайдэмюль нашы войскі, з баямі прасоўваючыся ўперад, выйшлі на подступы да горада Шлопе. Нямецкі гарнізон, які заняў зручныя і загадзя падрыхтаваныя пазіцыі, аказваў упорнае супраціўленне. Нашы падраздзяленні адрэзалі праціўніку шляхі адыходу, а затым штурмам занялі горад Шлопе,—вузел шасейных дарог і моцны апорны пункт абароны немцаў. На другім участку нашы войскі авалодалі гарадам Фройдэнфір. Знішчана да 2 батальёнаў нямецкай пяхоты, спалена і падбіта 14 танкаў праціўніка.

* * *

На паўночным усходзе і ўсходзе ад горада Франкфурт на Одэры нашы войскі прадаўжалі наступленне. Не гледзячы на адлігу, якая пачалася, совецкія часці настойліва прасоўваюцца ўперад, знішчаючы на сваім шляху гарнізоны апорных пунктаў праціўніка. Пасля жорсткіх баёў занят горад Зоненбург, які знаходзіцца ў 8 кілометрах ад горада і крэпасці Кюстрын. У выніку імклівага абходнага манеўра і атакі з фронта нашы войскі авалодалі моцным апорным пунктам абароны немцаў горадам Цыленцыг. Варожыя войскі выбіты таксама з горада Рэпен, які размешчан у 18 кілометрах на ўсходзе ад Франкфурта на Одэры. У ходзе баёў разгромлена некалькі часцей праціўніка, толькі што перакінутыя на гэты ўчастак фронта. У ліку іншых трафеяў захоплена ў немцаў 350 чыгуначных вагонаў і платформ, з іх 16 платформ з самалётамі.

На ўсходзе і паўднёвым усходзе ад горада Секешфехервар праціўнік, сканцэнтраваўшы буйныя сілы танкаў і пяхоты, за апошні час неаднаразова прабаваў прабіцца на дапамогу сваёй групіроўцы, акружанай у горадзе Будапешце. Як паведамлялася ўжо, цаною велізарных страт, немцам спачатку ўдалося некалькі прасунуцца ўперад. Знясілеўшы ворага ў абарончых баях, нашы войскі прадпрынялі моцныя атакі. Ударам з поўдня і поўначы совецкія танкісты, пехацінцы і артылерысты зламалі варожае супраціўленне і акружылі групу нямецкіх войск. У непрацяглым баі варожая група, запіснутая з усіх бакоў, была ліквідавана. Толькі на працягу дня знішчана звыш 2.000 гітлераўцаў, падбіта і спалена 39 нямецкіх танкаў і бронетранспарцёраў. Захоплена многа гармат, мінамётаў, кулямётаў і аўтамашын праціўніка.

* * *

На 2-м Беларускім фронце на бок Чырвонай Арміі перайшоў камандзір 1 батальёна 30 мотапалка 18 нямецкай мотадывізіі капітан Генрых Дэпта: Перабежчык расказаў: «Нябачаны размах наступлення совецкіх войск ашаламіў нас. Я ўдзельнічаў у паходзе нямецкай арміі ў Францыю, ваяваў у Афрыцы, у Італіі і на розных участках совецка-германскага фронта. Я быў у многіх баях і перанёс многа горкіх хвілін. Аднак такога паражэння, якое мы панярпелі ў студзеньскія дні, я яшчэ ніколі не перажываў. Мой батальён, які налічваў 650 актыўных штыкоў, быў знішчан за некалькі дзён. Маланкавыя ўдары рускіх войск дэмаралізавалі не толькі салдат, але і афіцэраў. Цяпер нават неспрактыкаваныя і блізарукія афіцэры бачаць, што Германія стаіць на краі бездані. Камандзір 30 мотапалка палкоўнік Шэнэ і камандзір 18 мотадывізіі генерал-маёр Бельзен у асабістых гутарках неаднаразова гаварылі, што цяпер, калі ўсім відавочны крах Германіі, недарэчна прадаўжаць супраціўленне. Так думалі многія афіцэры, але яны не рашаюцца дзейнічаць. Наступленне Чырвонай Арміі канчаткова пераканала мяне ў тым, што вайна хутка скончыцца поўным разгромам нямецкай арміі і знішчэннем гітлераўскага рэжыму. Я зразумеў, што пры ўмовах, якія склаліся, бяссэнсна прадаўжаць барацьбу, і перайшоў на бок Чырвонай Арміі».

Зварот з нямецкай катаргі

БРЭСТ, 2 лютага. (БЕЛТА). З Інстэрбурга, Ельса, Ротэнбурга і іншых гарадоў Усходняй Прусіі сюды прыбылі першыя эшалоны совецкіх грамадзян, гвалтоўна пагнаных на катаргу ў Германію. Больш 20 тысяч палякаў, рускіх, украінцаў, беларусаў ужо вярнуліся на радзіму. Іх страшэнны выгляд без слоў гаворыць аб жудасных умовах існавання ў няволі. Як жывёлу адбіралі совецкіх дзяўчат нямецкія гаспадыні і прымушалі працаваць на сябе.

— З Кільскага канцэнтрацыйнага лагера мяне ўзяла немка Берта—жонка галоўнага ўрача кільскай больніцы,—гаворыць 20-гадовая Надзя Чырок, якая прабыла на катарзе больш трох год. —Прымушалі працаваць як заводную машыну. На маіх плячах ляжала ўся гаспадарка. За малейшую правіннасць Берта біла мяне бізуном; есці давалі толькі раз у суткі, спала я на падлозе ў кухні. Яшчэ горшы лёс спаткаў маіх падруг: Мані гаспадыня вывернула руку, Клары адсекла пальцы на назе.

Так расказвае адна з тых, якія вызвалены з фашысцкай катаргі доблесным Чырвонай Арміяй.

На пункце для прыбываючых з Германіі арганізаваны сталовыя з узмоцненым харчаваннем. Яны забяспечваюцца бялізнай, вопраткай, абуткам. Хворым аказваецца медыцынская дапамога. Працуюць стацыянарная больніца і шпіталь. Выратаваныя совецкія грамадзяне, якія адпраўляюцца далей, атрымліваюць прадукты і грошы. На пункт дастаўляюцца газеты, штодзённа чытаюцца зводкі Совецкага Інформбюро, праводзяцца даклады на палітычныя тэмы.

Рэспубліканская нарада работнікаў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі

2 лютага прадаўжала сваю работу рэспубліканская нарада работнікаў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі. Прадаўжаліся спрэчкі па дакладу намесніка Старшыні Соўнаркома БССР тав. Шаўрова «Аб станові шчы і мерах павелічэння вытворчасці тавараў шырокага спажывання і паляпшання бытавога абслугоўвання працоўных».

Старшыня Белкаапромсовета тав. Марголін у сваім выступленні сказаў:

— За час, што прайшоў пасля вызвалення раёнаў Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адноўлена 370 арцелей. За 1944 год выпушчана прадукцыі на 21 мільён рублёў. З-за нездавальняючай работы раду раёнаў і арцелей дзяржава не дадана прадукцыі на 12 мільёнаў рублёў. Больш паспяхова выконваўся план па тых промыслах, дзе сыравіна завезена, дзе не патрабавалася асаблівых намаганняў для арганізацыі вытворчасці, напрыклад, у швейнай і абутковай галінах. Але вось, скажам, такія прадпрыемствы, як ткацкія, аднаўляліся і развіваліся дрэнна. У Магілёўскай вобласці яшчэ толькі думаюць падрыхтаваць да работы ў будучым 2 ткацкія станкі. Дрэнна развіваецца трыкатажная вытворчасць, харчовыя прадпрыемствы, сарван план па выпуску металапрадукцыі.

Тав. Марголін падверг рэзкай крытыцы дзейнасць віцебскага горпромсаюза, які даў прадукцыі шырокага спажывання ўсяго толькі на 79 тысяч рублёў, баранавіцкага аблмногапромсаюза, у сістэме якога арганізавана толькі 9 арцелей. Варты пераймання вопыт работы маладзечанскага аблмногапромсаюза, які пайшоў па правільнаму шляху развіцця рознастайных промыслаў.

У бягучым годзе вялікія задачы стаяць перад прамысловай кааперацыяй рэспублікі. У пяць разоў павялічан план гэтага года ў параўнанні з мінулым. Неабходна гэтае дзяржаўнае заданне выканаць і перавыканаць.

Аб ходзе аднаўлення сістэмы лясной промкааперацыі расказаў у сваім выступленні старшыня Белкалеспромсаюза тав. Нехаеў.

— Прадпрыемствы лясной промкааперацыі, — гаворыць ён, — аднаўляюцца вельмі нездавальняюча. План 1944 года ў радзе абласцей сарван. Магілёўская вобласць, напрыклад, выканала план 1944 года па выпрацоўцы абоза, мэблі, лесахімічных прадуктаў усяго толькі на 19,3 процанта. Палеская вобласць, дзе ёсць найбагацейшая лясная сыравіна, таксама заданне не выканала.

Тав. Нехаеў гаворыць аб агідных адносінах да арцелей лясной промкааперацыі з боку раду раённых і абласных арганізацый. Арцелі, якія вырабляюць каштоўныя лесахімічныя прадукты і маюць велізарнае абароннае і народнагаспадарчае значэнне, не карыстаюцца ўвагай з боку многіх райкомаў партыі і райвыканкомаў (Магілёўская і Маладзечанская вобласці).

У 1945 годзе праграма Белкалеспромсаюза павялічана ў 15 разоў у параўнанні з мінулым годам. Неабходна карэнным чынам палепшыць кіраўніцтва арцелямі з боку Белкалеспромсаюза і ліквідаваць недаацэнку гэтай важнейшай галіны народнай гаспадаркі ў раёнах рэспублікі.

Пра бытавое абслугоўванне насельніцтва сталіцы рэспублікі — Мінска гаварыў у сваім выступленні сакратар Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Глебаў.

— У мінскіх арцелях,—гаворыць ён,— працуе нязначная колькасць людзей, у той-жа час на розных прадпрыемствах горада, напрыклад, на фабрыцы-кухні, працуе пямала кваліфікаваных спецыялістаў — шаўцоў, краўцоў. Трэба іх вярнуць на сваю вытворчасць.

Тав. Новікава, сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б, расказвае аб рабоце мясцовай прамысловасці і промкааперацыі вобласці. Яна гаворыць, што за ўвесь час пасля вызвалення вобласці ў раёне не было ніводнага прадстаўніка Наркоммясцпрома. Дрэнна развіваецца харчовая прамысловасць. Гэтая галіна выпадае з поля зроку промкамбінатаў. Тав. Новікава гаворыць аб тым, што было-б мэтазгодным стварыць у абласцях міжраённыя харчовыя промкамбінаты з падпарадкаваннем іх аблмясцпромам.

На прадпрыемствах мясцовай прамысловасці і промкааперацыі вельмі дрэнна настаўлены ўлік і справаздачнасць. Аб гэтым гаворыць у сваім выступленні тав. Рабава (Наркамфін БССР). Яна прыводзіць факты аб кур'ёзах адпускных цэн. Напрыклад, у Маладзечна тысяча штук цэглы каштуе 395 рублёў, а ў Пінску—140 рублёў. Трэба сур'ёзную ўвагу ўдзяліць пытанню сабекошту прадукцыі, норм і расцэнак.

Аб задачах гандлюючых арганізацый і іх узаемадзеянні з мясцовай прамысловасцю і промкааперацыяй гаварыў нарком гандлю БССР тав. Выхадцаў.

— У 1940 годзе,—гаворыць ён,—прадукцыя мясцовай прамысловасці і промкааперацыі складала ў таваравабароце рэспублікі 13,5 процанта. У 1944 годзе яна не складала ні аднаго процанта. Большасць вырабляемых тавараў прадаецца з прадпрыемства, мінаючы гандлёвую сетку. Адна з прычын нездавальняючай работы мясцовай прамысловасці і промкааперацыі тоіцца ў няведанні Наркоммясцпромам і кааператыўнымі цэнтрамі становішча спраў на месцах, шырока не выкарыстоўваецца надомніцтва. Многія дырэктары промкамбінатаў, старшыні арцелей і саюзаў хварэюць «гігантаманіяй» і чакаюць, пакуль будуць набудаваны велізарныя вытворчыя карпусы і поўнасцю механізавана выпрацоўка, не выкарыстоўваюць усе магчымасці для вырабу тавараў шырокага спажывання.

У 1945 годзе перад гандлюючымі арганізацыямі рэспублікі пастаўлена задача даць на 40 мільёнаў рублёў рознай прадукцыі—шляхам арганізацыі свінаадкорму, лову рыбы, нарыхтоўкі і перапрацоўкі дзікарастучых.

Тав. Колышкін, загадчык аддзела мясцовай прамысловасці ЦК КП(б)Б, падрабязна спыніўся на прычынах нездавальняючай работы мясцовай прамысловасці і промкааперацыі, невыканання імі вытворчых планаў у 1944 годзе. Партыйныя і совецкія арганізацыі раёнаў не ўдзялялі сур'ёзнай увагі рабоце гэтых важнейшых галін народнай гаспадаркі, кіравалі імі павярхоўна, не вялі барацьбы за выкананне праграмы строга па асартыменту. Падрабязна гаварыў тав. Колышкін аб шляхах падрыхтоўкі кадраў, лепшай арганізацыі працы, разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва.

Вельмі дрэнна пастаўлена на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці і промкааперацыі партыйна-палітычная работа. Агітацыйна-масавая работа вядзецца ў большасці выпадкаў у адрыве ад вытворчых задач. Неабходна ўзняць арганізуючую ролю партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных арганізацый у выкананні праграмы і павелічэнні выпуску тавараў шырокага спажывання.

Нарком мясцовай прамысловасці БССР тав. Лапета адзначыў, што рад промкамбінатаў выпускаюць прадукцыю ў мізэрнай колькасці. Нярэдкі выпадкі калі на прадпрыемствах адбываецца частая змена дырэктараў, што адмоўна адбіваецца на вытворчасці.

Гаворачы аб задачах мясцовай прамысловасці ў 1945 годзе, тав. Лапета заклікаў усіх работнікаў змагацца за выкананне і перавыкананне плана, за ўсямернае расшырэнне асартыменту тавараў, выпускаемых на базе мясцовай сыравіны.

Аб задачах па адраджэнню забытых промыслаў гаварыў у сваім выступленні старшыня Белкаапсаюза тав. Катаводаў.

Сістэма спажывецкай кааперацыі мае таксама магчымасць арганізаваць на сяле свае прадпрыемствы. У гэтым годзе спажывецкая кааперацыя перапрацуе на 50 мільёнаў рублёў дзікарастучых, даўшы на 20 мільёнаў рублёў розных тавараў шырокага спажывання, нарыхтаваўшы 15 тысяч тон грыбоў.

У спрэчках таксама выступілі тт. Канановіч — сакратар Бабруйскага абкома КП(б)Б, Лішкоў—загадчык гродненскага аблмясцпрома, Букштынаў — намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома, Жукоўскі—старшыня Белкапінсаюза, Куцак — сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б і другія.

З вялікай прамовай выступіў на нарадзе цёпла сустрэты прысутнымі Старшыня Соўнаркома БССР тав. Панамарэнка. Тав. Панамарэнка паставіў перад работнікамі мясцовай прамысловасці і промкааперацыі, перад абласнымі і раённымі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі рад практычных задач па ўсямернаму расшырэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і прадуктаў харчавання з мясцовай сыравіны.

Пад бурныя апладысменты ўдзельнікі нарады паслалі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну.

На гэтым нарада закончыла сваю работу.

Выданне брашуры „Па ленінскаму шляху, пад вадзіцельствам Сталіна“

Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры выпусціла асобнай брашурай даклад Г. Ф. Александрава, зроблены ім 21 студзеня 1945 года на ўрачыста-жалобным паседжанні, прысвечаным 21-й гадавіне з дня смерці В. І. Леніна — «Па Ленінскаму шляху, пад вадзіцельствам Сталіна».

Дэлегацыя совецкіх профсаюзаў вярнулася ў Маскву

31 студзеня ў Маскву вярнулася з паездкі ва Францыю дэлегацыя совецкіх профсаюзаў у саставе сакратара ВЦСПС Л. Н. Салаўёва — кіраўніка дэлегацыі і членаў дэлегацыі—старшыні ЦК профсаюза рабочых суднабудаўнічай прамысловасці Н. А. Гайсёнак, старшыні ЦК профсаюза работнікаў сувязі Н. І. Бахгорскага, прадстаўніка профсаюза работнікаў вышэйшых школ і навуковых устаноў Н. А. Гаўрылава і Т. К. Кошэлевай — сакратара дэлегацыі.

Дэлегацыя была накіравана ВЦСПС па запрашэнню Усеагульнай Французскай Канфедэрацыі Працы. З 27 снежня 1944 года па 24 студзеня 1945 года яна наведала 11 буйнейшых прамысловых цэнтраў Францыі і азнаёмілася з работай прадпрыемстваў авіяцыйнай, аўтамабільнай, металургічнай, вугальнай, суднабудаўнічай, тэкстыльнай і другіх галін прамысловасці і чыгуначнага транспарта. Дэлегацыя таксама азнаёмілася з дзейнасцю розных грамадскіх і культурных арганізацый краіны. Яна ўсюды была сустрэта з велізарным натхненнем, выражэннем сімпатыі і дружбы французскіх працоўных да совецкага народа, Чырвонай Арміі, Маршала Сталіна.

Дэлегацыя выступіла на 63 мітынгах і прафсаюзных сходах, на якіх прысутнічала больш 100 тысяч чалавек.

У заключэнне сваёй работы яна выступіла на 25-тысячным мітынгу парыжскіх рабочых і служачых. Дэлегацыя была прынята главой Часовага Ўрада Французскай рэспублікі генералам дэ Голем.

Аб партыйна-палітычнай рабоце сярод трактарыстаў, рабочых і служачых МТС

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Н. В. КІСЯЛЁВА на рэспубліканскай нарадзе дырэктароў і парторгаў МТС і МТМ)*

Таварышы! Партыя і ўрад паставілі перад намі ў якасці асноўнай гаспадарча-палітычнай задачы—аднавіць у найкарацейшыя тэрміны разбураную нямецкімі акупантамі сельскую гаспадарку Беларусі.

«Нам,—сказаў таварыш Сталін,—неабходна поўнасцю ліквідаваць выніні гаспадарання немцаў у раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі. Гэта вялікая агульнанародная задача. Мы можам і павінны вырашыць гэтую цяжкую задачу ў кароткі тэрмін».

Барацьба за выкананне гэтай вялікай агульнанароднай задачы, пастаўленай перад совецкім народам вялікім Сталіным, вызначае дзейнасць усіх партыйных, комсамольскіх, совецкіх і гаспадарчых арганізацый рэспублікі на бліжэйшы час.

На выкананне гэтага гістарычнага ўказання правадыра мы павінны мабілізаваць усю вытворчую і палітычную актыўнасць працоўных Беларускай ССР.

ЦК ВКП(б) у снежні месяцы 1944 года ў сваім рашэнні па справаздачнаму дакладу Гомельскага абкома КП(б)Б абавязаў Гомельскую партыйную арганізацыю на працягу двух год аднавіць пасеўныя плошчы і ўраджайнасць вырошчваемых сельскагаспадарчых культур да даваеннага ўзроўню.

Гэтая канкрэтная задача, пастаўленая ЦК ВКП(б) перад Гомельскай партыйнай арганізацыяй, якая вызначае тэмпы аднаўлення сельскай гаспадаркі, у роўнай меры адносіцца да ўсіх абласных партыйных арганізацый Беларусі. Аднавіць па працягу двух год пасеўныя плошчы і ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур да даваеннага ўзроўню — такая наша важнейшая задача.

Нямецкія акупанты нанеслі велізарныя страты сельскай гаспадарцы Беларусі і вельмі падарвалі яе вытворчую магутнасць.

Пасеўныя плошчы ва ўсходніх абласцях Беларусі за годы нямецкай акупацыі скараціліся на 45 процантаў. Па цэламу раду раёнаў пасеўныя плошчы скараціліся ў чатыры—пяць разоў і нават больш.

Пладародныя, высокаўраджайныя палі Беларусі за тры годы нямецкай акупацыі зараслі бур'янам, палыном і іншым пустазеллем. У выніку дрэннай апрацоўкі палёў рэзка ўпала ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур.

Да вайны сельская гаспадарка Беларусі была высокамеханізаванай. На палях калгасаў і соўгасаў Беларусі працавала 10.300 трактараў, 1.665 камбайнаў. Нямецкія варвары разбурылі і разграбілі МТС і соўгасы, лешшыя машыны яны вывезлі ў Германію.

Вельмі цяжкі ўдар немцы нанеслі конскаму пагалоўю. Ва ўсходніх абласцях рэспублікі пасля нямецкага гаспадарання асталося ўсяго толькі 25 процантаў даваеннага пагалоўя рабочых коней. Да таго-ж трэба адзначыць, што пагалоўе коней, якое асталося, вельмі дрэннае.

Не гледзячы на гэтыя велізарныя цяжкасці, мы абавязаны на працягу двух год аднавіць пасеўныя плошчы і давесці ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур да даваеннага ўзроўню.

Кожны з нас — і радавы, і адказны работнік—павінны на працягу бліжэйшых год працаваць за дваіх і траіх. Прыдзецца напрацаваць у сельскай гаспадарцы і нашым старычкам, і нашай дзетвары—школьнікам у перыяд летніх канікул.

Асаблівая роля ў сельскай гаспадарцы належыць МТС. Нашы МТС таксама павінны працаваць лепш даваеннага часу. Кожны трактарыст, кожны камбайнер і машыніст павінен значна перакрыць даваенную норму выпрацоўкі. Па ўсходніх абласцях рэспублікі ў 1940 годзе ў сярэднім выпрацавана 284 гектары мяккага ворыва на адзін 15-сільны трактар. Гэта невялікая выпрацоўка, яе з поспехам можна перакрыць у два разы. Гэта даказалі сваёй работай перадавікі МТС рэспублікі. У тым-жа 1940 годзе Віцебская МТС у сярэднім выпрацавала 463 гектары на кожны 15-сільны трактар, Церахоўская МТС — 469 гектараў, Дзяржынская МТС дала яшчэ больш высокую выпрацоўку — 476 гектараў на кожны 15-сільны трактар.

Яшчэ больш высокіх паказчыкаў выпрацоўкі на трактар далі асобныя стаханаўцы. Так, напрыклад, трактарыстка Капыльскай МТС Соня Рачок на 15-сільным трактары разам са сваёй зменшчыцай узарала за сезон 1.100 гектараў. Трактарыст гэтай-жа МТС Казлоў са сваім напарнікам узаралі за сезон на 15-сільным трактары 1.200 гектараў.

Як працавалі нашы МТС у мінулым годзе?

У цэлым па рэспубліцы план трактарных работ выканан. Аднак, трэба адзначыць, што паказчыкі выпрацоўкі па трактар невысокія. У цэлым па рэспубліцы выпрацоўка на трактар склала ўсяго толькі 142 гектары. Гомельская область план трактарных работ выканала на 105 процантаў, а выпрацоўка на 15-сільны трактар склала ўсяго толькі 145 гектараў. План трактарных работ па рэспубліцы быў невялікі, кожная МТС магла і павінна была перавыканаць гэты план, што некаторыя МТС з поспехам прарабілі.

Прапойская МТС выканала план трактарных работ на 219 процантаў і выпрацавала 306 гектараў на кожны 15-сільны трактар. Лепшая брыгада гэтай МТС тав. Берасцень Афанасія Пятровіча выпрацавала на 15-сільны трактар 358 гектараў. Добра працавала ў 1944 годзе Рудакоўская МТС. Яна дала выпрацоўку — 352 гектары на кожны 15-сільны трактар.

Калі-б усе МТС рэспублікі працавалі так, як Рудакоўская МТС, мы ўзаралі-б трактарным паркам на 250 тысяч гектараў больш. Такая работа МТС замяніла-б дадаткова 10.000 коней.

Таварышы! Нашы МТС тояць у сабе велізарныя рэзервы для аднаўлення сельскай гаспадаркі. Нашы МТС могуць і павінны працаваць лепш, даваць больш высокую выпрацоўку на трактар і іншыя складаныя машыны.

Вось што далі перадавыя МТС і лепшыя стаханаўцы нашай краіны ў 1944 годзе. Першая Міхнеўская МТС, Маскоўскай абласці, выпрацавала ў сярэднім на кожны 15-сільны трактар 787 гектараў. Азоўская МТС, Растоўскай абласці, выпрацавала на трактар 837 гектараў, Літвінаўская МТС, Карагандзінскай абласці, выпрацавала на трактар 720 гектараў.

А вось імёны лепшых трактарыстаў нашай краіны. Брыгада Дашы Гармаш з Рыбноўскай МТС, Разанскай абласці, у 1944 годзе выпрацавала на кожны 15-сільны трактар 1.866 гектараў. Кожны трактар Дашы Гармаш выпрацаваў столькі-ж, колькі выпрацавалі ў Гомельскай абласці 13 трактараў. Усім вядомая двойчы ўзнагароджаная трактарыстка Паша Ангеліна, якая вярнулася з эвакуацыі ў Стара-Бешаўскую МТС, Сталінскай абласці, выпрацавала сваёй брыгадай па 1.100 гектараў на кожны трактар. Каралёў Васілій з Комсамольскай МТС, Маскоўскай абласці, выпрацаваў на трактар 1.620 гектараў.

Пятнаццацісільны трактар СХТЗ можа даць яшчэ больш. Даша Гармаш узяла абавязацельства выпрацаваць у 1945 годзе 2.000 гектараў на трактар.

У бягучым 1945 годзе мы павінны рэзка палепшыць работу МТС. Вопыт перадавых МТС, вопыт трактарыстаў-стаханаўцаў Беларусі паказвае, што ў нашых умовах упаўне могуць і павінны быць МТС—пяцісотніцы і шасцісотніцы, г. зн. такія МТС, якія выпрацоўваюць на кожны 15-сільны трактар 500 і 600 гектараў. У нашых умовах упаўне могуць і павінны быць трактарысты — тысячнікі і паўтаратысячнікі, г. зн. такія трактарысты, якія выпрацоўваюць на калёсным 15-сільным трактары за сезон 1.000 і 1.500 гектараў. Я падтрымліваю дырэктара Дрысенскай МТС тав. Гелера, які тут на нашай нарадзе перадаў абавязацельства свайго калектыва—дабіцца ў 1945 годзе выпрацоўкі на кожным трактары СХТЗ па 1.000 гектараў. Гэту ініцыятыву неабходна ўсямерна падтрымаць.

* * *

Што патрэбна для таго, каб у нас рэзка палепшылася работа МТС, каб у нас у Беларусі паявіліся вядомыя на ўсю краіну МТС — пяцісотніцы і шасцісотніцы, каб у нас паявіліся знатныя на ўсю краіну трактарысты — тысячнікі і паўтаратысячнікі?

Для гэтага, перш за ўсё, трэба карэнным чынам палепшыць партыйна-палітычную работу ў МТС.

Большэвіцкая партыя заўсёды надавала выключна вялікае значэнне палітычнай рабоце ў масах. Ва ўмовах вялікай Айчыннай вайны значэнне палітычнай работы, якая выхоўвае і цэментыруе людзей, яшчэ больш павысілася.

Большэвіцкая агітацыя заклікана, як адзначыў вялікі Ленін, усяляць бадзёрасць у сэрцы, заклікаць да цвёрдасці духу, напампажаць свядомасць і ўмацоўваць дысцыпліну.

Узмацненне партыйна-палітычнай работы ў масах з'яўляецца цяпер адной з важнейшых задач усіх партыйных арганізацый рэспублікі. Цяпер трывалы поспех у любой справе можа быць дасягнуты толькі арганізацыяй шырокіх мас, прамым зваротам да іх патрыятычных пачуццяў, уменнем узняць гераізм, энтузіязм працоўных, уменнем сканцэнтраваць іх намаганні на важнейшай чарговай задачы. Партыйна-палітычная работа павінна адыграць важнейшую ролю ў выкананні баявых задач, якія стаяць перад нашымі МТС.

Машынна-трактарныя станцыі, як арганізацыйна-вытворчыя і палітычныя цэнтры калгаснай вёскі, адыгрываюць велізарную ролю ў справе развіцця і ўздыму калгаснай вытворчасці. Тым большую ролю яны закліканы выканаць цяпер у Беларусі, калі нам патрабуецца аднавіць сельскую гаспадарку ў кароткія тэрміны і ў цяжкіх умовах веснавога часу. Без добра пастаўленай масава-палітычнай работы сярод трактарыстаў, рабочых і служачых МТС нельга забяспечыць уздым работы ў МТС. Між тым трэба прызнаць, што партыйна-палітычная работа ў большасці МТС пастаўлена яшчэ нездавальняюча.

Гэта тлумачыцца тым, што многія комуністы МТС, парторгі і другія партыйныя работнікі пачалі забываць, што: **«Самі гаспадарчыя поспехі, іх трываласць і працягласць цалкам і поўнасцю залежаць ад поспехаў партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы... Без гэтай умовы гаспадарчыя поспехі могуць аказацца пабудаванымі на пяску». (Сталін).**

Гэтае важнейшае ўказанне таварыша Сталіна набывае цяпер яшчэ больш глыбокі сэнс і патрабуе ад нас рашуча палепшыць партыйна-палітычную работу ў масах.

Што трэба зрабіць для таго, каб добра паставіць партыйна-палітычную работу ў МТС?

У сувязі з тым, што ў большасці МТС у нас яшчэ няма партыйных арганізацый, першая наша задача — стварыць у кожнай МТС партыйную арганізацыю. У гэтых мэтах райкомы партыі абавязаны накіраваць для работы ў МТС 3—4 комуністаў, якія і складуць ядро партыйнай арганізацыі МТС.

Затым неабходна райкомам і абкомам партыі падабраць у кожную МТС парторга. Пасада вызваленага парторга, сакратара партарганізацыі МТС устаноўлена рашэннем ЦК ВКП(б). Сакратаром партарганізацыі або парторгам МТС павінен быць моцны партыйны работнік, здольны шырока разгарнуць партыйна-палітычную работу ў МТС, здольны арганізаваць і ўзначаліць вытворчую і палітычную актыўнасць рабочых і служачых МТС і забяспечыць паспяховае і высокаякаснае выкананне і перавыкананне вытворчых задач.

Парторг, партыйная арганізацыя МТС павінны ўмела прыцягваць да справы лепшых людзей з беспартыйных, акружыць сябе шырокім беспартыйным актывам і заўсёды памятаць указанні таварыша Сталіна аб тым, што:

«Сувязь з масамі, умацаванне гэтай сувязі, гатоўнасць прыслухоўвацца да голасу мас, — вось у чым сіла і непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва».

Далей неабходна, каб у кожнай МТС была і добра працавала комсамольская арганізацыя. Партыйныя арганізацыі павінны ўдзяляць самую сур'ёзную ўвагу рабоце сярод комсамольцаў і моладзі. Райкомы партыі сумесна з райкомамі комсамола павінны накіраваць для работы ў МТС 5—10 найбольш актыўных комсамольцаў, якія і складуць аснову касцяк комсамольскай арганізацыі МТС. Трэба правесці адпаведную работу па палепшанню росту радоў ЛКСМБ і даць магчымасць лепшым людзям з моладзі МТС уступіць у рады Ленінскага комсамола.

Большэвіцкія клопаты аб кадрах МТС— важнейшая задача партыйных арганізацый

Асноўная задача партыйнай арганізацыі, дырэктара і парторга МТС заключаецца ў тым, каб падабраць на работу ў МТС добрыя кадры, навучыць іх лепшай рабоце на машынах, выхаваць стаханаўцамі, ударнікамі і замацаваць на рабоце ў МТС.

Праверкай на месцы ў радзе раёнаў устаноўлена, што старыя вопытныя трактарысты, камбайнеры, машыністы, якія раней працавалі ў МТС, у сучасны момант працуюць радавымі калгаснікамі ў калгасах, вартавымі, чорнарабочымі ў розных гаспадарчых установах.

У Чырвонапольскім раёне, Магілеўскай абласці, раённай ашчадкасай загадвае інжынер-механізатар, які мае вышэйшую адукацыю. У гор. Мінску ў друкарні імені Сталіна працуе чорнарабочым тав. Башкін, які мае вышэйшую агранамічную адукацыю.

Такіх прыкладаў у нас даволі многа.

Толькі па адной Віцебскай абласці выяўлена да 100 спецыялістаў сельскай гаспадаркі, якія працуюць не па спецыяльнасці, у тым ліку толькі ў Оршы 19 агранамаў.

Такое нерацыянальнае выкарыстанне спецыялістаў наносіць велізарныя страты народнай гаспадарцы і з'яўляецца найгоршым відам безгаспадарчасці. Дырэктары і парторгі МТС з дапамогай райкомаў партыі павінны вярнуць на работу ў МТС усіх кваліфікаваных работнікаў сельскай гаспадаркі, якія працуюць у сучасны момант не па спецыяльнасці.

У сельскіх раёнах самыя лепшыя спецыялісты сельскай гаспадаркі, механізацыі і па будаўніцтву павінны быць у МТС. Аб гэтым павінны паклапаціцца ў першую чаргу дырэктары і парторгі МТС і ў гэтай справе ім павінны дапамагчы раённыя камітэты партыі, перш за ўсё сакратары райкомаў па кадрах.

Другая задача партыйнай арганізацыі, дырэктара і парторга МТС у галіне кадраў заключаецца ў тым, каб стварыць рабочым і служачым МТС добрыя матэрыяльна-бытавыя ўмовы. Строгая патрабавальнасць да трактарыстаў, рабочых МТС павінна суправаджацца клопатамі аб іх патрэбах.

Перш за ўсё трэба забяспечыць кожнага работніка МТС кватэрай. Высокакваліфікаваным спецыялістам трэба падабраць лепшыя кватэры.

Многія нашы МТС не маюць у сучасны момант сваіх пасёлкаў. Задача партарганізацый, дырэктара і парторга МТС заключаецца ў тым, каб па пачыну ногінцаў неадкладна прыступіць да будаўніцтва сядзібы і пасёлка МТС, шырока прыцягнуць да гэтага будаўніцтва насельніцтва раёна.

Будаўніцтва МТС трэба весці метадам народнай будоўлі. На будаўніцтва МТС у кожным раёне прыцягнуць тысячы калгаснікаў і сотні калгасных фурманак. Трэба кожнаму сямейнаму рабочаму прадаставіць кватэру. Далей, неабходна кожнай сям'і рабочага выдзеліць індывідуальны гарод размерам 0,12—0,15 гектара. Выдзеленыя гароды замацаваць за рабочымі не на адзін і не на два годы, а на ўвесь перыяд яго работы ў МТС. Аб гэтым трэба сказаць рабочым поўным голасам з тым, каб яны ўгнойвалі свой гарод, лепш яго даглядалі і атрымлівалі больш высокі ўраджай. Трэба параіць рабочым МТС, каб яны на гэтым участку зямлі пасадзілі фруктовыя дрэвы, кусты маліны, смародзіны.

Неабходна аказаць рабочым МТС дапамогу ў абзавядзенні жывёлай. У кіраўніцтва МТС ёсць магчымасці для аказання дапамогі рабочым і служачым МТС у набыцці жывёлы. Аднаму рабочаму дырэктар МТС можа выдаць грашовы крэдыт, другому дапаможа купіць у калгасніка цёлку або парасё.

Дырэктар і парторг МТС усямерна павінны дапамагчы сваім рабочым у набыцці хатняй птушкі.

Клопаты дырэктара і парторга МТС аб рабочых і служачых павінны заключацца ў тым, каб на сядзібе, у пасёлку МТС была добрая сталовая, якая працавала-б без перабою, рыхтавала рабочым і служачым добрыя, смачныя, сытныя і танныя абеды. Для забеспячэння сталовай, МТС павінна мець сваю невялікую падсобную гаспадарку.

Партыйная арганізацыя, дырэктар і парторг МТС павінны паклапаціцца аб тым, каб на сядзібе МТС быў арганізаван магазін або ларок. У сучасны момант у большасці МТС няма магазінаў і ларкоў, у выніку чаго рабочым і служачым МТС прыходзіцца хадзіць у кааператыўныя крамы за 5—10 кілометраў, што з'яўляецца вельмі нязручным. Наркамгандаль, Белкаапсаюз, аблспажыўсаюзы і райспажыўсаюзы павінны пайсці на дапамогу МТС, арганізаваць разам з кіраўніцтвам МТС магазін або ларок і бесперабойна забяспечваць яго прамысловымі і харчовымі таварамі. У сувязі з вайной мы адчуваем пэўныя цяжкасці ў таварах шырокага спажывання, тым не менш трактарыстам, камбайнерам і другім работнікам МТС нашы гандлюючыя арганізацыі павінны дапамагчы гэтымі таварамі.

У кожнай МТС павінна быць добрая лазня. Рабочым і служачым МТС, асабліва рамонтным рабочым, трактарыстам, камбайнерам лазня патрэбна і зімой і летам. Лазня карысна для здароўя трактарыстаў, але карысць ад лазні ёсць і трактарам. Агульнавядома, чым больш ахайны трактарыст, тым ён лепш даглядае трактар. Чым чысцей ходзіць сам трактарыст, тым чысцей выглядае яго трактар.

Партарганізацыя, дырэктар і парторг МТС павінны паклапаціцца аб медыцынскім абслугоўванні рабочых і служачых МТС. Наркамат аховы здароўя, абласныя аддзелы аховы здароўя і раённыя аддзелы аховы здароўя павінны дапамагчы рабочым і служачым МТС у медыцынскім абслугоўванні. У МТС, аддаленых ад раённых цэнтраў, трэба арганізаваць медпункты.

Некаторыя нашы МТС размешчаны далёка ад школ, і дзецям рабочых і служачых МТС прыходзіцца хадзіць у школу за некалькі кілометраў. Наркомасветы, аблана і райана павінны дапамагчы МТС арганізаваць школы на сядзібах МТС або наблізіць школы да сядзіб.

Далей, трэба на сядзібе МТС мець культурны ачаг — клуб, дзе-б можна было паглядзець кінокарціну, разгарнуць самадзейнасць, як было да вайны, напрыклад, у Хойніцкай МТС, — хор, драмгурток, спартыўныя каманды. Пры клубе трэба мець бібліятэку. Тады сядзіба МТС будзе лепшым месцам у раёне, куды будуць імкнуцца лепшыя кадры.

Таварышы! Клопатамі аб кадрах, увагай да іх мы забяспечым у МТС устойлівасць, стабільнасць кадраў, спынім цякучасць рабочай сілы. Кожны дырэктар і парторг МТС павінны лічыць галоўнейшай сваёй задачай стварэнне ўстойлівых кадраў. Аб рабоце МТС трэба будзе меркаваць па таму, наколькі ўстойлівы ў яе кадры.

Трэцяя задача ў галіне кадраў МТС — сістэматычна павышаць тэхнічны ўзровень рабочых і служачых МТС. Трэба правільна звязваць пытанні палітычнай работы з барацьбой за павышэнне кваліфікацыі механізатарскіх кадраў МТС. У зімовы час — адносна больш свабодны ад работы — трэба пры МТС праводзіць цэлы рад курсаў: па падрыхтоўцы новых трактарыстаў, па перападрыхтоўцы трактарыстаў, курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы машыністаў малацілак і ільноперабілак, кароткатэрміновыя курсы прыцэпшчыкаў і г. д. На курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў трэба прымаць найбольш падрыхтаваных, дысцыплінаваных і добра працуючых калгаснікаў. Дырэктары і парторгі МТС павінны асабіста прымаць удзел у адборы на курсы трактарыстаў.

Асаблівую ўвагу на гэтых курсах трэба ўдзяліць практычнаму азнаямленню курсантаў з трактарам, рамонтнай справай і ваджэннем трактара. У радзе МТС Палескай абласці, як устаноўлена праверкай, дырэктары МТС не адпускаюць на курсы гаручае для практычнай язды на трактарах, матывіруючы свае дзеянні імкненнем зэканоміць гаручае. Мне думаецца, што гэтыя дырэктары прайграюць, а не выйграюць. Маладыя трактарысты, дрэнна навучаныя ваджэнню трактара, будуць перапальваць гаручае ў палявых умовах.

Не ўсюды прынята праводзіць курсы па перападрыхтоўцы трактарыстаў.

Дырэктары многіх МТС лічаць курсы па перападрыхтоўцы непатрэбнай справай, лішняй тратай сродкаў і часу. Гэта вялікая памылка. Я вельмі рэкамендую дырэктарам і парторгам МТС сабраць усіх старых трактарыстаў на курсы па перападрыхтоўцы і на працягу месяца паўтарыць з імі вывучэнне трактара. «Паўтарэнне, як гавораць, — маці вучэння». Можна быць упэўненым, што трактарысты, якія прайшлі перападрыхтоўку, будуць працаваць лепш, і сродкі, затрачаныя на іх вучобу, у многа раз акупяцца павышэннем прадукцыйнасці працы.

Кадры трэба вучыць не толькі тэхніцы, іх трэба вучыць палітграмаце. Тэхнічная вучоба і палітычнае выхаванне кадраў павінна праходзіць непарыўна. На курсах трактарыстаў трэба вывучаць не толькі трактарную справу, але і палітграмату. Больш таго, і заняткі па трактарнай справе трэба праводзіць з пункту гледжання палітычнага выхавання трактарыстаў.

З трактарыстамі і рабочымі МТС трэба перыядычна праводзіць агульныя сходы, на якіх павінны выступаць з дакладамі сакратары райкомаў, лектары абкомаў партыі па тэмы: аб міжнародным становішчы, аб падзеях на франтах Айчыннай вайны або аб рабоце совецкага тыла ў годы Айчыннай вайны.

Побач з гэтымі дакладамі на сходах трэба абмяркоўваць практычныя пытанні вытворчай і культурна-асветнай работы МТС. Напрыклад, аб ходзе выканання соцыялістычных абавязацельстваў, аб удзеле трактарыстаў у рамонце трактараў, аб арганізацыі пры МТС драматычнага або харавога гуртка, аб правядзенні лыжных спаборніцтваў з суседняй МТС, або аб падрыхтоўцы трактарыстаў да літаратурнай канферэнцыі па кнізе Б. Гарбатава «Непакароныя» або па кнізе Н. Остроўскага «Як гартавалася сталь». Правядзенне літаратурнай канферэнцыі ў МТС—з'ява не новая. У радзе МТС яны праводзіліся і мелі вялікі поспех. Героі такіх выдатных твораў, як раман Остроўскага «Як гартавалася сталь», натхнялі трактарыстаў на новыя працоўныя подвігі. Перыядычна трэба праводзіць таксама лекцыі і на навукова-папулярныя тэмы.

Шырэй размах соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху. Вырасцім знатных майстраў трактарыстаў-тысячнікаў, паўтаратысячнікаў!

Соцыялістычнае спаборніцтва — магутны рычаг уздыму прадукцыйнасці працы, магутны сродак актыўнага ўдзелу працоўных у соцыялістычным будаўніцтве.

Таварыш Сталін сказаў: **«Самае выдатнае ў спаборніцтве заключаецца ў тым, што яно робіць карэнны пераварот у поглядах людзей на працу, бо яно ператварае працу з зазорнага і цяжкага бремя, якім яна лічылася раней, у справу чэсці, у справу славы, у справу доблесці і геройства».**

Трэба ахапіць соцыялістычным спаборніцтвам усю масу рабочых і служачых МТС рэспублікі. Для гэтага трэба арганізаваць заключэнне дагавароў соцыялістычнага спаборніцтва: а) на індывідуальныя паказчыкі—паміж двума трактарыстамі, паміж двума камбайнерамі, паміж двума машыністамі і г. д.; б) на групавыя паказчыкі — паміж трактарнымі брыгадамі, агрэгатамі камбайнаў, малатарань; в) на паказчыкі цэлых калектываў — паміж суседнімі МТС. І далей я-б лічыў неабходным заключыць дагаворы на лепшыя паказчыкі работы МТС паміж нашымі абласцямі. Усе калектывы МТС—трактарысты, камбайнеры, рабочыя і служачыя МТС рэспублікі павінны быць актыўнымі ўдзельнікамі ўсесаюзнага соцыялістычнага спаборніцтва і імкнуцца заваяваць пярэдняе месца.

Заключэнне дагавароў неабходна правесці, як важнейшае гаспадарча-палітычнае мерапрыемства, з шырокім абмеркаваннем прымаемых абавязацельстваў на сходах рабочых і служачых МТС і ўсебаковым асвятленнем гэтых сходаў у раённым, абласным і рэспубліканскім друку. Усе нашы газеты павінны апублікаваць абавязацельствы трактарыстаў, брыгадзіраў і калектываў МТС у цэлым. Абавязацельствы павінны быць высокімі, выкананне якіх патрабуе напружання, актыўнасці.

Далей, пасля заключэння дагавароў трэба будзе ўстанавіць сталы кантроль і ўзаемаправерку выканання ўзятых абавязацельстваў. Вялікую дапамогу ў гэтай справе павінны зноў аказаць нам нашы газеты. Нашы газеты павінны пастаянна сачыць за работай МТС і на сваіх старонках перыядычна асвятляць вынікі выканання ўзятых абавязацельстваў. Усе газеты — раённыя, абласныя і рэспубліканскія—з нумара ў нумар павінны адзначаць імёны лепшых трактарыстаў, брыгадзіраў, механікаў, дырэктараў МТС і асвятляць іх вопыт работы. Побач з паказам стаханаўцаў, выдатнікаў МТС, газеты павінны моцна крытыкаваць адстаючых, бестурботных работнікаў МТС.

Неабходна штомесячна падводзіць вынікі соцыялістычнага спаборніцтва і ўстанаўляць пераможцаў сярод трактарыстаў, трактарных брыгад і цэлых калектываў МТС. Лепшы трактарыст і лепшая брыгада па адной МТС атрымліваюць прэмію дырэктара МТС, лепшы трактарыст і лепшая брыгада сярод МТС абласці атрымліваюць прэмію абласнога зямельнага аддзела, лепшыя трактарысты і лепшая брыгада сярод МТС рэспублікі атрымліваюць прэміі Наркамзема БССР.

Стаханаўцаў МТС трэба, не шкадуючы сродкаў, прэміраваць. Лепш прэміраваць натурай — адрэзам матэрыяла, музыкальным інструментам, гадзіннікам, бібліятэкай і г. д. Можна быць упэўненым у тым, што сродкі, якія выдаткаваны на прэміраванне, поўнасцю вернуцца ў выглядзе павышэння прадукцыйнасці працы стаханаўцамі. Апрача таго, неабходна ўстанавіць для перадавых МТС пераходныя чырвоныя сцягі—у абласцях: сцяг абкома партыі і выканкома абласнога Совета і тры пераходныя чырвоныя сцягі ў рэспубліцы: сцяг ЦК КП(б)Б і Соўнаркома БССР, сцяг ЦК ЛКСМБ і ЦК прафсаюза работнікаў МТС і сцяг Наркамзема рэспублікі.

Гэтыя сцягі для большай дзейснасці соцыялістычнага спаборніцтва трэба ўручаць перадавым МТС штомесячна, а не ў канцы сельскагаспадарчага года, як гэта было да гэтага часу.

Далей неабходна аднавіць разбураную немцамі ў горадзе Мінску рэспубліканскую Дошку пачоту калгасаў і МТС, на якую ў канцы сельскагаспадарчага года трэба заносіць перадавыя калгасы і МТС рэспублікі.

Таварышы! Ёсць многа і іншых цікавых форм соцыялістычнага спаборніцтва, заахвочвання трактарыстаў, папулярызацыі іх вопыту. У некаторых МТС Маскоўскай абласці ў калгасах раёна дзейнасці МТС праводзілі спецыяльныя так званыя «дні трактарыстаў», якія звычайна прыўрочваліся да летніх народных свят. На многалюдных сходах, калгаснікі ў гэтыя дні адзначалі лепшых стаханаўцаў МТС падарункамі. Гэтыя дні чэсці і славы трактарыстаў выклікалі велізарны вытворчы ўздым усяго калектыва МТС, і работа ў далейшым значна паляпшалася. Вясной пасля правядзення веснавой сяўбы трэба арганізаваць эстафетны велапрабег у горад Мінск трактарыстаў двух—трох лепшых МТС рэспублікі, якія паказалі ўзоры работы на сяўбе. Гэтай эстафетай мы пакажам лепшых стаханаўцаў-трактарыстаў, іх вопыт работы на ўсю рэспубліку.

Заахвочваючы перадавікоў соцыялістычнага спаборніцтва МТС, партыйныя і совецкія органы і іх кіраўнікі павінны для стаханаўцаў МТС, у якіх нямецкія акупанты спалілі дамы, у першую чаргу і на самым відным месцы ў вёсцы пабудаваць вялікія выгодныя і прыгожыя дамы.

Соцыялістычнае спаборніцтва — асноўная форма масавай палітычнай работы ў МТС. Поспех спаборніцтва — у яго гласнасці, у шырокай папулярызацыі вопыту перадавікоў.

Таварышы! Усямерна папулярызуючы стаханаўцаў і іх вопыт работы, мы не павінны забываць і ўдарнікаў. Стаханаўцаў, якія перавыконваюць нормы ў 3—4 разы і больш, звычайна, нямнога. Ударнікаў, якія перавыконваюць нормы на 10—20 процантаў, — велізарная армія. Партыйная арганізацыя, дырэктар і парторг МТС павінны адзначаць ударнікаў, усяляк заахвочваць іх.

(Працяг гл. на 3-й стар.).

Удзельнікі рэспубліканскай нарады дырэктараў МТС і МТМ (злева направа): М. М. Гаўрыловіч — дырэктар Бягомльскай МТС, Е. Ф. Казлоў — дырэктар Першай мінскай МТС, В. Г. Кулыгін — дырэктар Крупскай МТС, В. Д. Цімашок — дырэктар Дзержынскай МТС, І. С. Дзебалтоўскі — парторг Дзержынскай МТС, І. В. Лапша — начальнік Мінскага абласнога зямельнага аддзела і І. В. Асмалоўскі — дырэктар Сенічанскай МТС. Фото Л. Мазелева.

*) Друкуецца па скарочанай стэнаграме.

Аб партыйна-палітычнай рабоце сярод трактарыстаў, рабочых і служачых МТС

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Н. В. КІСЯЛЁВА на рэспубліканскай нарадзе дырэктароў і парторгаў МТС і МТМ

Працяг. Пачатак гл. на 2-й стар.

На тэрыторыі МТС павінна быць арганізавана Дошка пачоту стаханаўцаў і ўдарнікаў, на якую неабходна перыядычна заносіць, побач са стаханаўцамі, і ўдарнікаў. Трэба адзначаць ўдарнікаў і на сходах, вылучаць іх у прэзідыум схода, першым прадастаўляць слова для выступлення і г. д.

Партыйная арганізацыя павінна наблізіць да сябе ўдарнікаў, запрашаць іх на адкрытыя партыйныя сходы, даваць ім паасобныя невялікія даручэнні, напрыклад: напісаць заметку ў газету, прыняць удзел у праверцы дагавароў сацыялістычнага спаборніцтва. Больш пісьменным таварышам можна даручаць праводзіць у трактарных брыгадах чыткі газет, рэдагаванне газет, «Баявых лісткоў» і г. д. Партыйныя арганізацыі павінны выхоўваць з ліку лепшых трактарыстаў — стаханаўцаў і ўдарнікаў — большэвіцкіх агітатараў.

Некаторыя парторгі не прыцягваюць гэтых людзей для правядзення агітацыйнай работы па той прычыне, што яны не заўсёды ўмеюць гладка і прыгожа гаварыць. Выдатныя словы былі сказаны ў свой час з гэтага поваду С. М. Кіравым:

«Сіла большэвіцкага прамоўцы-прапагандыста, — гаворыць ён, — не ў тым, што ён гаворыць гладка і прыгожа. Не! Магутнасць яго заключаецца ў тым, што ён правільна выкладае дырэктывы партыі, рашэнні Цэнтральнага Камітэта. Вось у чым сіла агітатара-большэвіка».

Трэба таксама мець на ўвазе, што агітатары з ліку лепшых, больш пісьменных трактарыстаў-стаханаўцаў, ударнікаў—будуць агітаваць не толькі словам, але і справай, асабістым прыкладам. Агітацыя асабістым прыкладам, як вядома, мае першачарговае значэнне.

Таварышы! Уся партыйная і палітычная работа ў МТС, якая праводзіцца многімі формамі і метадамі, павінна заўсёды быць мэтаімкнёнай, дзейснай. Яна павінна быць арганізавана так, каб яна рабіла станоўчы ўплыў на развіццё сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, на павышэнне прадукцыйнасці працы. Мы павінны пастаянна памятаць словы вялікага Леніна аб тым, што **«прадукцыйнасць працы—гэта, у канчатковым выніку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадскага ладу».**

Калі мы мабілізуем усе сілы партыйных і комсамольскіх арганізацый і па-сапраўднаму наладзім у МТС партыйна-палітычную работу, па-сапраўднаму арганізуем сацыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух, то мы будзем мець у Беларусі ўжо ў сёлетнім 1945 годзе дзесяткі трактарыстаў — тысячнікаў і паўтаратысячнікаў, сотні трактарыстаў — сямісотнікаў і васьмісотнікаў і тысячы трактарыстаў — пяцісотнікаў. **«Сацыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш, даганяй лепшых і дабіся агульнага ўздыму».** (Сталін).

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна з'явіцца магутным сродкам агульнага ўздыму работы МТС рэспублікі.

Трактарная брыгада—цэнтральнае месца палітычнай работы з трактарыстамі

Партыйная арганізацыя абавязана сістэматычна працаваць над павышэннем палітычнага ўзроўню работнікаў МТС і перш за ўсё, трактарыстаў — гэтай масавай, вядучай прафесіі МТС.

Цэнтрам палітычнага выхавання трактарыстаў павінна стаць трактарная брыгада. Для таго, каб добра была пастаўлена палітычная работа ў брыгадзе, партыйная арганізацыя МТС павінна стварыць у брыгадзе адпаведныя ўмовы і забяспечыць яе неабходнымі сродкамі.

Для паспяховага разгортвання палітычнай работы сярод трактарыстаў у палявых умовах, перш за ўсё неабходна для кожнай брыгады зрабіць **перасовачны вагончык.** Пры наяўнасці добрага вагончыка трактарысты радзей будуць хадзіць у вёску і менш адрывацца ад работы на трактары. Такім чынам і праца іх будзе больш прадукцыйнай. У вагончыку можна пасядаць, паабедаць, адпачыць у часе перапынку работы на трактары, сагрэцца ад дажджу, моцнага ветру. Вагончык асабліва патрэбен трактарысту ранняй вясной і позняй восенню, калі бываюць моцныя халады. Адначасова гэты вагончык будзе месцам палітычнай работы з трактарыстамі брыгады.

Вагончык неабходна адпаведным чынам абсталяваць. Трэба, каб у вагончыку былі партрэты правадыроў, лозунгі, плакаты, вітрына загадаў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна, паведамленні Совінформбюро і дошка паказчыкаў ходу сацыялістычнага спаборніцтва, якую трэба сістэматычна запаўняць. Апрача гэтага, у вагончыках неабходна мець невялікую бібліятэчку тэхнічнай, палітычнай і мастацкай літаратуры.

Якія кнігі павінны быць у гэтай бібліятэцы? Кніга таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза», прамовы таварыша Сталіна на нарадах калгаснікаў, перадавікоў сельскай гаспадаркі і стаханаўцаў прамысловасці, брашуры аб Героях Совецкага Саюза, аб Зоі Космодзем'янскай, аб лётчыку Гастэла, аб гераічна'і барацьбе беларускіх партызан і іншыя. З кніг мастацкай літаратуры—«Радуга» Ванды Васілеўскай, «Непакароныя» Барыса Гарбатава, «Як гартавалася сталь» Н. Остроўскага, выбраныя творы Янкі Купалы, «Сцяг брыгады» Аркадзя Куляшова, творы Якуба Коласа, апавяданні Міхася Лынькова. Добра было-б мець у бібліятэцы выбраныя творы Некрасава, Пушкіна, Тургенева, Гогаля, Чэхава. І апрача гэтага — некалькі падручнікаў і даведачнікаў па трактарах і сельскагаспадарчых машынах. Партыйная арганізацыя павінна загадзя паклапаціцца аб тым, каб у вагончыку кожнай трактарнай брыгады заўсёды былі свежыя газеты.

Найбольш даступная, шырока распаўсюджаная форма палітычнай работы ў трактарнай брыгадзе — гэта чытка газет і гутаркі. Партыйная арганізацыя МТС павінна падабраць для гэтай мэты ў кожную трактарную брыгаду палітычна пісьменнага агітатара, бяседчыка-чытчыка. Для гэтай работы трэба прыцягнуць сельскую інтэлігенцыю, галоўным чынам комсамольцаў - настаўнікаў, загадчыкаў хат-чытальнь, работнікаў сельсоветаў і раённы актыў. Нарэшце, і ў саставе брыгады могуць быць пісьменныя комсамольцы-трактарысты, і тады яны яшчэ з большым поспехам могуць працаваць агітатарамі-бяседчыкамі. Агітатар са складу трактарыстаў павінен быць стаханаўцам, ударнікам. Нашы агітатары павінны быць аўтарытэтнымі, мець уплыў і весці за сабой масы.

Перад пачаткам палявых работ трэба правесці двух—трохдзённы семінар агітатараў-бяседчыкаў у раённым камітэце партыі.

На семінары неабходна падрабязна разабраць з агітатарамі важнейшыя формы і метады агітацыйна-масавай работы, расказаць, што і як чытаць у газетах. Неабходна расказаць, як трэба будаваць гутарку, як лепш увязваць пытанні бягучых падзей з канкрэтнымі задачамі трактарыстаў, як агітатар павінен дапамагчы брыгадзе выканаць і перавыканаць план трактарных работ, як лепш аформіць выпуск насценнай газеты, «Баявога лістка» і г. д.

Апрача таго на гэтых семінарах сіламі прапагандыстаў і дакладчыкаў райкомаў і абкомаў партыі трэба прачытаць некалькі кваліфікаваных дакладаў і лекцый пра кнігу таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза», даклад аб ваенным і міжнародным становішчы Совецкага Саюза, аб перамозе ленінска-сталінскай палітыкі дружбы народаў СССР, аб кіруючай і арганізуючай ролі большэвіцкай партыі і азнаёміць агітатараў з палітычнай картай свету.

Каб лепш працавалі агітатары-бяседчыкі, на працягу ўсяго сезона трактарных работ неабходна перыядычна праводзіць пры МТС нарады агітатараў па абмену вопытам работы і абмеркаванню чарговых тэм для гутарак у трактарных брыгадах, а парторгі і сакратары партарганізацый МТС павінны сістэматычна інструктаваць агітатараў, дапамагаць ім, накіроўваць іх работу.

* * *

Аб чым павінен чытаць і гутарыць у трактарнай брыгадзе агітатар? Перш за ўсё, трэба добра азнаёміць трактарыстаў з гістарычным дакладам таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі. Далей, агітатар павінен знаёміць трактарыстаў з загадамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна. Гэтыя загады хвалююць і радуюць усю нашу краіну, яны ўсяляюць бадзёрасць, упэўненасць у хуткую перамогу над праклятым ворагам, яны ўзнімаюць палітычную і вытворчую актыўнасць нашага народа. Далей, неабходна штодзённа чытаць зводкі Совінформбюро. Калі ў брыгаду па якой-небудзь прычыне не прышла свежая газета, трэба атрымаць зводку Совінформбюро з райцэнтра па тэлефону. Аб гэтым павінны паклапаціцца нашы райпарткабінеты.

Агітатар павінен як мага больш канцэнтраваць увагу трактарыстаў на артыкулах і апавяданнях аб гераічных подвігах нашых воінскіх падраздзяленняў і паасобных камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі. На гэтых артыкулах і апавяданнях трэба выхоўваць трактарыстаў у духу совецкага патрыятызма, развіваць у трактарыстаў прагнасць да самаадданай працы, імкненне быць падобным на герояў Айчыннай вайны. Агітатар павінен растлумачыць, што перамогу над ворагам заваёўваюць і на фронце і ў тылу. Трэба шырока ўкараніць у свядомасць трактарыстаў лозунг: **«Трактар у баразне, што танк у баі — абодва нясуць смерць Гітлеру!».**

Трэба расказаць пра гераічную барацьбу беларускага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, шырока папулярызаваць імёны слаўных сыноў беларускага народа — Гастэла, Талаліхіна, Даватара, Смалячкова і многіх другіх герояў беларускага народа. Іх імёны і подвігі заўсёды павінны служыць прыкладам гераізму, самаахвярнасці, любві і адданасці сваёй Радзіме. Агітатары ў сваіх гутарках павінны расказаць пра слаўныя подвігі беларускіх партызан і партызанак. Трэба расказаць, як на працягу трох гадоў яны вялі гераічную барацьбу супроць гітлераўскіх акупантаў і аказалі неацэнімую дапамогу Чырвонай Арміі ў вызваленні Беларусі. Імёны тысяч і тысяч герояў і гераінь партызанскага руху ніколі не забудзе наш народ, іх бясстрашша і подвігі будуць жыць у стагоддзях, памнажаючы веліч і славу нашай Радзімы.

Трэба чытаць і растлумачваць паведамленні Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі аб зладзеяннях немцаў. Некаторыя таварышы глыбока памыляюцца, гаворачы, што насельніцтва, якое знаходзілася ў тылу ворага ў часе нямецкай акупацыі, бачыла больш нямецкіх зверстваў, чым пра іх напісана ў паведамленнях Камісіі. Ні адзін чалавек не мог бачыць усяго таго, што тварылі мільёны нямецкіх салдат. Пра зверствы немцаў трэба расказваць і чытаць больш.

На гэты бок агітацыйна-прапагандысцкай работы ўказана ў пастанове ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветнай работы сярод насельніцтва». «Улічваючы, што насельніцтва Беларускай ССР на працягу трох гадоў было пазбаўлена праўдзівай совецкай інфармацыі і знаходзілася пад уздзеяннем хлуслівай фашысцкай прапаганды, партыйныя арганізацыі КП(б) Беларусі,—гаворыцца ў пастанове ЦК ВКП(б),—павінны шырока выкарыстаць у агітацыйна-прапагандысцкай рабоце факты крывавых злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў супроць беларускага народа, зрабіць гэтыя злачынствы акупантаў вядомымі ўсяму насельніцтву, выкрываць нямецкую разбойніцкую спробу заняволення і знішчэння народаў СССР, распальваць у масах нянавісць да ворага». Трактарысты павінны ведаць пра Трасцянецкі лагер смерці пад Мінскам, пра страшныя магілы пад Кіевам, дзе зажыва пахаваны тысячы совецкіх грамадзян, пра польскі Майданек, у якім было загублена жыццё больш мільёна чалавек.

Паведамленні аб зверствах немцаў выклікаюць лютую нянавісць да заклятага ворага і жаданне хутчэй разграміць яго. А з гэтага вынікае—трэба лепш працаваць, даваць больш высокую выпрацоўку і тады перамога будзе заваявана хутчэй.

Трэба чытаць і гутарыць пра работу совецкага тыла. Агітатар павінен расказаць пра перабудову нашай прамысловасці ў годы вайны, пра перабазіраванне многіх абаронных заводаў на Ўсход—Урал, Сібір. Пра самаадданую і гераічную работу масквічоў, свярдлоўцаў, чэлябінцаў і многіх гераічных калектываў і паасобных рабочых цэлага раду іншых гарадоў, якія забяспечваюць Чырвоную Армію з кожным днём ва ўсё больш узрастаючай колькасці—самалётамі, танкамі, гарматамі, мінамётамі, боепрыпасамі і іншым узбраеннем. Трэба расказаць трактарыстам пра подвігі працаўнікоў совецкага тыла, якія пабудавалі за годы вайны дзве домны на Магнітабудзе, дзве домны на Чэляббудзе, пра пабудову першай чаргі металургічных заводаў ва Узбекістане і Казахстане, пра ўвод у строй на Урале і ў Сібіры многіх мартэнаўскіх печаў, пра ўвод у строй некалькіх дзесяткаў шахт, пра тое, што Маскоўскі басейн пасля вызвалення яго ад нямецкіх акупантаў поўнасцю адноўлен і ў сучасны момант дае вугалю ў два разы больш, чым да вайны. Трэба расказаць пра пабудову за годы вайны цэлага раду новых чыгунак—Паўночна-Пячорская чыгунка—ад Котласа да Варкуты, Волжская—ад Казані да Сталінграда, Паўночна-Каўказская — ад Астрахані да Махач-Кала і інш. Трэба расказаць і прачытаць трактарыстам аб рабоце і вялікай творчай ініцыятыве нашых знатных стаханаўцаў прамысловасці. Трактарысты і рабочыя МТС і МТМ павінны вучыцца ў стаханаўцаў нашай прамысловасці, праяўляць ініцыятыву ў рабоце, вучыцца самаадданай працы, успрымаць іх вопыт работы па павышэнню прадукцыйнасці працы.

Трэба больш праводзіць гутарак пра героіку совецкіх людзей, пра іх высокую і свядомую дысцыпліну, іх беражлівыя адносіны да сацыялістычнай уласнасці, пра іх працоўныя подвігі, пра іх бязмежную любоў да Радзімы, большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, які выратаваў нашу Радзіму ў цяжкую гадзіну ад нямецкага заняволення і вядзе наш народ ад адной перамогі да другой.

Агітатары павінны вялікую ўвагу ў часе гутарак удзяляць пытанням норм выпрацоўкі і аплаты працы трактарыстаў. Растлумачэннем норм выпрацоўкі і распэнак аплаты агітатары павінны выклікаць у трактарыстаў імкненне працаваць яшчэ лепш, каб больш зарабіць. У трактарнай брыгадзе трэба мець насценную газету і абавязкова арганізаваць сістэматычны выпуск баявых лісткоў, плакатаў-«маланак» і іншых форм пізавога друку і наглядная агітацыі. Трэба падабраць добрых рэдактараў і дапамагаць ім у рабоце, інструктаваць іх. Тады наш пізавы друк будзе шырока асвятляць ход сацыялістычнага спаборніцтва, папулярызаваць вопыт перадавікоў і рэзка крытыкаваць гультаёў і бестурботных трактарыстаў.

Трэба ў брыгаду запрашаць аграпома, які павінен праводзіць гутаркі пра агратэхніку, каб трактарысты больш свядома змагаліся за высокі ўраджай. Брыгады павінны сістэматычна наведваць механікі МТС, яны павінны наладзіць у брыгадах тэхнічную вучобу.

У брыгаду трактарыстаў павінны прыходзіць работнікі райкома партыі, райвыканкома, райкома комсамола і аказваць трактарыстам дапамогу ў палепшанні партыйна-палітычнай і вытворчай работы.

Падхопім заклік калектыва Стара-Бешаўскай МТС— па-большэвіцку падрыхтуемся да веснавой сяўбы— своечасова і высокаякасна адрамантуем трактары і сельскагаспадарчыя машыны

Важнейшая ваенна-гаспадарчая задача, на выкананне якой павінна быць зараз сканцэнтравана асобая ўвага партарганізацый, усе намаганні работнікаў МТС — гэта рамонт трактараў і сельгасмашын.

Трэба так адрамантаваць трактары, каб яны на працягу ўсяго сельскагаспадарчага сезона працавалі без перабояў, не выходзячы са строю.

Добра будзе адрамантаван трактарны парк — пройдзе добра веснавая сяўба, і калгасы тым самым змогуць закласці грунтоўную аснову высокага ўраджаю.

Калі МТС упусцяць лепшыя тэрміны правядзення рамонту, яны вымушаны будуць рамантаваць трактары і сельгасмашыны наспех, нядобраякасна, што можа прывесці да вялікіх цяжкасцей у правядзенні веснавой сяўбы.

Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны рэгулярна праводзіць праверку якасці рамонту трактараў. Прыём адрамантаваных трактараў неабходна праводзіць па меры іх выхаду з рамонту. Кожны трактар у паасобку павінен быць абавязкова тэхнічна праверан, абкатан, каб можна было спадзявацца, што ён будзе працаваць без перабояў. Толькі трактар, які прайшоў абкатку і прынят Дзяржаўнай камісіяй можна лічыць адрамантаваным.

Каб добра і своечасова адрамантаваць трактары і сельгасмашыны, мы павінны лепш арганізаваць палітычную работу на рамонце, лепш паставіць палітычнае выхаванне рамонтных рабочых і паклапаціцца аб іх культурна-бытавых умовах.

Трэба шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне рамонту. Трэба мацней падхапіць і падтрымаць заклік трактарыстаў, рабочых і служачых Стара-Бешаўскай МТС, Сталінскай вобласці, да ўсіх работнікаў МТС, МТМ і рамонтных заводаў Совецкага Саюза — аб арганізацыі Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва на рамонце трактараў і сельскагаспадарчых машын.

Калектыў Стара-Бешаўскай МТС, заклікаючы разгарнуць спаборніцтва на рамонце, прыняў у той-жа час і рад іншых абавязацельстваў, накіраваных па ўзорную, культурную арганізацыю ўсёй гаспадаркі МТС, якія павінны з'явіцца грунтоўнай асновай бесперабойнай эксплаатацыі трактараў.

Трэба загадзя забяспечыць трактарныя брыгады пэўным камплектам запасных частак, з тым, каб невялікія паломкі трактараў можна было выпраўляць хутка ў палявых умовах. Трактарныя брыгады трэба забяспечыць заправачным інвентаром — лейкамі, насосамі. Трэба ва ўсе МТС падабраць раз'язных механікаў і забяспечыць іх транспартам.

Для паспяховай работы трактарнага парка вялікае значэнне маюць добра падабраныя падвозчыкі гаручага і вады. У мінулым годзе ў многіх МТС былі вялікія прастоі трактараў з-за нясвоечасовага падвозу гаручага і вады. Вось чаму трэба да пачатку выезду ў поле падабраць сталых возчыкаў вады і гаручага, уцягнуць іх у соцспаборніцтва, правесці з імі спецыяльную нараду, расказаць ім аб асобай важнасці іх работы.

Трэба, каб наш друк, раённыя, абласныя, рэспубліканскія газеты больш шырока асвятлялі ход соцспаборніцтва, дапамагалі ў рабоце МТС, разгарнулі большэвіцкую крытыку недахопаў у іх рабоце. Газета, — вучыў нас В. І. Ленін, — павінна быць не толькі калектыўным прапагандыстам і калектыўным агітатарам, але таксама і калектыўным арганізатарам.

Між тым нашы газеты да гэтага часу вельмі дрэнна асвятляюць ход соцспаборніцтва, вельмі вяла падхапілі пачын Стара-Бешаўскай МТС, а выдатны народны рух па будаўніцтву МТС, які разгарнуўся ў краіне па пачыну ногінцаў, нашы газеты, у тым ліку і рэспубліканскія («Звязда» і «Советская Белоруссия»),—фактычна абыйшлі. Гэты вялікі недахоп у рабоце нашых газет павінен быць хутка выпраўлен.

Шырэй разгарнуць соцспаборніцтва на рамонце трактараў і сельгасмашын, вышэй падняць тэмпы і якасць рамонту, арганізавана сустрэць веснавую сяўбу, узорна яе правесці і заваяваць у 1945 г. высокі ўраджай — такая наша задача.

* ☆ *

Таварышы! Вялікія гістарычныя дні, напоўненыя радасцю і славай, перажывае цяпер совецкі народ. Цяпер ужо ўвесь свет бачыць, што ў крывавай схватцы паміж гітлераўскай Германіяй і Совецкім Саюзам пераможцам выходзіць наша вялікая сацыялістычная Радзіма.

Таварыш Сталін ператварыў Чырвоную Армію ў самую магутную і найбольш перадавую з усіх сучасных армій, узброіў Чырвоную Армію навукай перамагаць любога, у тым ліку і наймацнейшага ворага.

За мінулы год нашы войскі выгналі немцаў з еўрапейскай тэрыторыі за межамі граніц СССР, роўнай больш чым мільёну квадратных кілометраў, і вызвалілі ад нямецкага ярма звыш 50 мільёнаў жыхароў зарубежных краін. Цяпер мы перажываем вялікія, радасныя дні новага імклівага наступлення Чырвонай Арміі. Больш 7.000 нямецкіх гарадоў і населеных пунктаў занята ў ходзе наступлення часцямі Чырвонай Арміі. Усё карацей і карацей становіцца шлях да Берліна. Цяпер Берлін аддзяляюць ад фронта менш чым 100 кілометраў. Наш народ упэўненым, цвёрдым поступам ідзе да канчатковай і поўнай перамогі. Цяпер няма такой сілы, якая магла-б зламаць або пахіснуць магутнасць совецкай дзяржавы. Чырвоная Армія поўна рашымасці завяршыць вайну пабеданосным уступленнем у Берлін.

Паспяховае наступленне Чырвонай Арміі натхняе ўсіх працоўных на новыя подвігі. Гераічны беларускі народ, які мужна змагаўся і змагаецца за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, напружвае ўсе сілы на хутчэйшае аднаўленне народнай гаспадаркі, з кожным днём аказвае ўсё большую і большую дапамогу фронту. Калгасы Беларусі датэрмінова выканалі план збожжапаставак і звыш плана здалі ў фонд Чырвонай Арміі больш 3 мільёнаў пудоў збожжа. Калгасы Беларусі выканалі поўнасцю план бульбапаставак. Рэспубліка паспяхова выканала план лесанарыхтовак.

Я выказваю ўпэўненасць у тым, што калектывы рабочых і служачых МТС будуць у першых радах барацьбітоў за аднаўленне народнай гаспадаркі, у першых радах стаханаўцаў і ўдарнікаў сельскай гаспадаркі.

Я ўпэўнен, што мы ўжо ў гэтым годзе будзем мець узорныя МТС, будзем мець выдатных майстраў—трактарыстаў, камбайнераў, машыністаў і другіх работнікаў МТС, самаадданая праца якіх наблізіць дзень нашай поўнай перамогі над заклятым ворагам і паскорыць аднаўленне сельскай гаспадаркі Совецкай Беларусі. (Бурныя апладысменты).

У адказ на слаўныя перамогі Чырвонай Арміі

МАЗЫР. **(Кар. «Звязды»).** Грандыёзнае наступленне Чырвонай Арміі выклікала сярод рамонтнікаў МТС вобласці новую хвалю вытворчага ўздыму. Рабочыя і трактарысты МТС бяруць абавязацельствы па датэрміноваму заканчэнню плана рамонту трактараў і сельгасмашын.

Калектыў Нараўлянскай МТС заканчвае рамонт трактараў. Тут поўнасцю закончан рамонт прычэпнага інвентару. Адрамантавана 17 плугоў, 2 сеялкі і культыватар. Разам з заканчэннем рамонтных работ рабочыя рыхтуюць інструменты і заправачныя прыстасаванні. Для гэтай справы вылучана спецыяльная тройка, на чале якой стаіць лепшы брыгадзір Сцяпан Кулажанка. Са сваімі напарнікамі ён абавязаўся падрыхтаваць дастаткова ключоў, вёдраў, лесек, насосаў і іншы інструмент для кожнага трактара.

МТС аказвае вялікую дапамогу калгасам па рамонту коннага інвентару. Кавалі МТС, якія цяпер не асабліва загружаны работай, арганізавалі спецыяльную брыгаду па правядзенню рамонту калгаснага інвентару. Гэтую брыгаду ўзначальвае каваль тав. Шульга. Брыгада адрамантавала ўжо калгасу «Іскра» 10 плугоў, калгасу «Большэвік Палесся»—15 плугоў. Такая-ж дапамога будзе аказана яшчэ 10 калгасам раёна, якія не маюць сваіх кавалёў.

Вялікіх вытворчых поспехаў дабіліся рамонтнікі Ельскай МТС. Усе рабочыя выконваюць дзённыя нормы на 150—200 процантаў. Трактарыст Арсен Канавод на зборцы матораў штодзённа выконвае норму выпрацоўкі на 180 проц., меднік Васіль Ванжа—на 220 процантаў. У МТС адрамантавана і прынята дзяржаўнай камісіяй 6 трактараў, заканчваюць рамонт яшчэ 6 трактараў, у іх трэба ўстанавіць толькі галоўкі блока. Апрача таго адрамантавана 6 задніх мастоў. Набліжаецца да канца рамонт прычэпнага інвентару.

Рабочыя гэтай МТС асвоілі выраб многіх частак. Так, сваімі сіламі тут зрабілі 60 штук штуцэраў і іншыя часткі. Разам з вырабам новых частак паспяхова праводзіцца рэстаўрацыя зношаных.

Набліжаюцца да заканчэння плана рамонту трактараў і сельгасмашын Рудакоўская МТС, Хойніцкага раёна, і Слабадская МТС, Мазырскага раёна.

А. ЛЯСНЫ.

ЛАТВЯНСКІ ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД

Побач са станцыяй Латва знаходзіцца цагельны завод. Да вайны ён даваў адзін мільён штук цэглы і на 50 тысяч літраў ганчарнай пасуды. Перад вайной завод расшырыўся. Быў абсталяван чаранічны цэх.

Дырэктар завода, былы партызан Даніл Аўсеевіч Нікіцін, знаёміць нас з прадпрыемствам. Кіруе заводам Даніл Аўсеевіч нядаўна, пасля вызвалення раёна ад нямецкіх захопнікаў. Да вайны ён кіраваў сельскім советам. Калі Чырвоная Армія вызваліла Шклоўскі раён, райком партыі накіраваў тав. Нікіціна аднаўляць завод.

— Цэгла патрэбна на аднаўленне гаспадаркі. І табе, як партызану, райком даручае аднавіць завод, даць цэглу на будаўніцтва,—заявіў яму сакратар райкома партыі.

Каб выпусціць першую прадукцыю, неабходна было аднавіць завод. Нямецкія разбойнікі абрабавалі і зруйнавалі завод, прычыніўшы гэтым самым страт на 180 тысяч рублёў.

Даніл Аўсеевіч з усёй энергіяй узяўся за аднаўленне завода. У выніку стараннай працы невялікага калектыва завода ў кароткі час быў абсталяван завод, які ў першы сезон даў 62 тысячы штук цэглы сырцу пры плане 60 тысяч штук.

І калі на заводзе быў абмяркован зварот радыёзаводцаў, цагельшчыкі рашылі аднавіць ганчарны цэх. За гэту справу ўзяўся Кузьма Парцянкін. Да вайны ён працаваў на гэтым заводзе, набыў багаты прапоўны вопыт.

Цэх адноўлен і даў першую прадукцыю—выпушчана ганчарнай пасуды на 4.000 літраў, што складае 200 процантаў задання.

Цяпер латвянскія цагельшчыкі дзейна рыхтуюцца да сезона бягучага года. На сядзібе завода кіпяць будаўнічыя работы. Цагельшчыкі ўзялі ў рукі тапары і пілы. Паспяхова ідзе будаўніцтва спецпажных навесаў. Нарыхтавана 50 тон торфу для апалу цэглы.

Датэрмінова закончыць падрыхтоўку завода да сезона, перавыканаць гадавы план выпуску цэглы і ганчарных вырабаў, даць па адбудову гаспадаркі 1 мільён цэглы, — гэтай думкай жыве калектыў цагельшчыкаў.

М. ЯРАВЫ (Кар. «Звязды»).

ШЭСЦЬ ЭШАЛОНАЎ ЛЕСУ ЗВЫШ ПЛАНА

ВІЛЕЙКА, 1 лютага. (БЕЛТА). Новымі вытворчымі поспехамі адказваюць лесарубы і возчыкі на гранды ёзныя перамогі Чырвонай Арміі.

Трэст «Вілейлеспром» нарыхтаваў у студзені звыш плана шэсць эшалонаў лесу. Выканана заданне па вывазцы драўніны.

Узоры самаадданай працы паказвае моладзь. 120 комсамольскіх звеньняў сістэматычна перавыконваюць вытворчыя нормы. Звяно маладых лесарубаў, якім кіруе тав. Хадасінская з Куранецкага лесапункта, выконвае рэгулярна па чатыры нормы.

14.300 НОВЫХ ДАМОЎ

МАЗЫР. **(Кар. «Звязды»).** У калгасах вобласці створаны дзесяткі будаўнічых брыгад, якія за мінулы год пабудавалі 14.300 новых дамоў для калгаснікаў.

Асабліва многа зрабілі па адбудове зруйнаваных немцамі вёсак калгаснікі Ельскага раёна. Тут пабудавана 1.584 дамы. Многія вёскі поўнасцю ўжо адбудаваны.

У Лельчыцкім раёне, дзе нямецкімі акупантамі былі знішчаны ўсе вёскі, пабудавана ўжо 3.203 новыя дамы. У Васілевіцкім раёне пабудавана 2.203 дамы. Таксама паспяхова ідзе будаўніцтва дамоў для калгаснікаў у Хойніцкім, Брагінскім, Нараўлянскім, Тураўскім і іншых раёнах вобласці.

ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛАН РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ

ГОМЕЛЬ, 2 лютага. (БЕЛТА). Калектыў Буда-Кашалеўскай МТС выканаў гадавы план рамонту трактараў. 13 машын гатовы да выхаду ў поле. Адрамантаваныя машыны прыняты з адзнакай «выдатна».

Выканала гадавы план рамонту трактараў і Рэчкаўская МТС, Свяцілавіцкага раёна.

Значна перавыканала студзеньскі план рамонту Лоеўская МТС. Тут 15 машын прыняты дзяржаўнай камісіяй з адзнакай «добра».

СОЎГАСЫ МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ ОБЛАСЦІ ЗАКОНЧЫЛІ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ

МАЛАДЗЕЧНА, 2 лютага. (БЕЛТА). Соўгасы вобласці выканалі планы капітальнага і бягучага рамонту трактараў. Амаль усе трактары ў совецкіх гаспадарках «Любань» і «Лукавец» прыняты дзяржаўнай прыёмачнай камісіяй з адзнакай «добра» і «выдатна».

Зараз узмоцнена рамантуецца сельгасінвентар.

НОВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ЛЯЧЭБНЫЯ УСТАНОВЫ

МАЗЫР, 2 лютага. (БЕЛТА). У вобласці адкрыты новыя дзіцячыя лячэбныя ўстановы. У Мазыры аднавіў работу Дом грудного дзіцяці. Пры ўсіх паліклініках створаны дзіцячыя кансультацыі. Адкрыта таксама дзіцячая больніца на 100 коек.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ СЕЛ БЕЛАРУСІ

За час пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у рэспубліцы праведзена вялікая работа па аднаўленню радыёсеткі. У многіх гарадах капітальна адрамантаваны радыёвузлы, адноўлены правадныя лініі. Пушчан у эксплаатацыю буйны радыёвузел у Бабруйску, аднаўленне якога праводзілася паскораным метадам.

Пачалося будаўніцтва буйнага радыёвузла ў Брэсце, які быў поўнасцю разбуран нямецкімі варварамі. З пускам адноўленага вузла будуць радыёфікаваны ўсе сёлы абласці.

Паспяхова праводзіцца радыёфікацыя сёл Гомельскай абласці. Тут ужо адноўлена 16 радыёвузлоў, якія абслугоўваюць больш 5.000 радыёкропак. Усяго ў рэспубліцы працуе 170 радыёвузлоў.

(БЕЛТА).

НОВЫЯ ДАМЫ ДЛЯ КАЛГАСНІКАЎ

БАРЫСАЎ, 31 студзеня. (БЕЛТА). Калі немцы акупіравалі Беларусь, многія калгаснікі Хахлоліцкага сельсавета пайшлі ў партызанскія атрады і наносілі моцныя ўдары па варожых тылах. У бяссільнай злабе фашысты спалілі тут 93 дамы. Пасля выгнання фашысцкай погані з беларускай зямлі калгаснікі, пад кіраўніцтвам старшыні сельсавета партызана тав. Курковіча, арганізавалі брыгаду цесляроў і энергічна ўзяліся за будаўніцтва новых дамоў. Зараз для калгаснікаў адбудаван 61 дом і нарыхтаваны зрубы для 15 новых дамоў.

Паспяхова ідзе будаўніцтва новых дамоў таксама ў Кішчына-Слабодскім, Зембінскім і іншых сельсоветах. Усяго ў раёне на будаўніцтве новых дамоў працуе 54 брыгады, якімі ахоплена 400 цесляроў. Пабудавана ўжо 955 новых дамоў, а для 150 жылых будынкаў нарыхтаваны зрубы.

УСТУПАЮЦЬ У РАДЫ ДОНАРАЎ

На сходзе калектыва Мінскага мясакамбіната, прысвечаным пабеданосному наступленню Чырвонай Арміі, выступіла работніца аднаго з цэхаў—жонка франтавіка Ліда Жэбуропак. Яна заявіла:

— Нашы доблесныя войскі гераічна громяць фашысцкага звера ў яго ўласнай бярлозе. Мы, работнікі і работніцы тыла, можам дапамагчы Чырвонай Арміі канчаткова дабіць ворага не толькі стаханаўскай работай на прадпрыемстве, але і ўступленнем у рады донараў, каб даць кроў для раненых байцоў. Я ўступаю ў рады донараў і заклікаю сваіх таварышоў па рабоце таксама стаць донарамі.

Зварот совецкай патрыёткі знайшоў гарачы водгук сярод рабочых. Адразу-ж у рады донараў уступіла 14 работнікаў мясакамбіната.

У некалькі радкоў

Гэтымі днямі адбыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па лыжах добраахвотнага спартыўнага таварыства «Працоўныя рэзервы», у якіх удзельнічалі каманды Магілеўскай, Баранавіцкай і Мінскай абласцей. Усяго ўдзельнічала 45 чалавек.

* * *

ГРОДНА. Лектар ЦК КП(б)Б тав. Позняк прачытаў для партыйна-совецкага актыва горада лекцыю на тэму: «Ваенна-палітычнае і міжнароднае становішча СССР».

Лекцыю праслухала больш 500 чалавек.

У ВАРШАВЕ

(Наш карэспандэнт маёр Н. Мядзведзеў нядаўна пабываў у сталіцы саюзнай нам Польшчы—Варшаве. Ніжэй мы друкуем яго карэспандэнцыю).

Над намі блакітнае неба. Побач—кіпучая, зеленаватая Вісла. Мы ідзем уздоўж ракі ў нядаўна вызваленую сталіцу Польшчы—Варшаву.

На правым беразе Віслы тысячы людзей. Яны прагнымі вачыма глядзяць праз раку, туды, дзе стаіць знявечаная снарадамі і бомбамі, але па-ранейшаму гордая і велічная Варшава. У іх, жыхароў Прагі, асталіся там родныя, знаёмыя, таварышы. Хвалямі ракі, нямецкім дротам, акопамі і кулямётамі яны былі адрэзаны ад Варшавы. Кожнаму з жыхароў Прагі хочацца хутчэй даведацца, што зараз адбываецца ў Варшаве. Але папасці туды амаль немагчыма. Усе масты праз Віслу немцы ўзарвалі яшчэ ў мінулым годзе. А Вісла—шырокая і імклівая рака, на сярэдзіне не замерзла. Лодак няма: іх таксама знішчылі немцы.

Набережная Віслы з боку Варшавы пустая. Там не паказваецца ніводзін чалавек. Мёртвыя руіны робяць сумнае ўражанне.

Аднак хочацца хутчэй у Варшаву. І найбольш рашучыя ідуць да руін чыгуначнага маста. Магутныя фермы скарэжаны ўзрывамі. Тоўстыя бэлькі сагнуты ў дугу. Паасобныя пралёты тырчаць вертыкальна. З цяжкасцю карабкаючыся па ўцалеўшых шпалах, ідзем праз Віслу. А яна бурліць і пеніцца пад нагамі, уносячы ў мора апошнія ўспаміны аб чорных днях нямецкай акупацыі.

І вось мы на левым беразе. Дротавая загарода, міннае поле, глыбокая траншэя з дзотамі і кулямётнымі пляцоўкамі. Тут яшчэ нядаўна сядзелі немцы, адсюль яны абстрэльвалі вызваленую Прагу. І адсюль яны паспешна ўцяклі, баючыся, што імкліва наступаючыя войскі Чырвонай Арміі адрэжуць ім шлях. У траншэі яшчэ вісяць нямецкія трафарэткі з надпісамі.

Набережная Віслы. Гэта калісці быў адзін з прыгажэйшых раёнаў Варшавы. Тут стаялі лепшыя будынкі. Цяпер набережная мёртвая. Шкілеты дамоў клічуць да справядлівай помсты.

Падымаемся ў горад. Кракаўская вуліца. Суцэльныя руіны. Няма ніводнага ўцалеўшага будынка. Ад цудоўнага будынка атэля «Брыстоль» асталася толькі цудам уцалеўшая залочаная шыльда.

Побач знаходзіцца велізарны кафедральны касцёл. Яго сцен не змаглі разбурыць немцы: яны дрэнна паддаваліся дынаміту і толу. Немцы ўзарвалі дах, узарвалі калоны. І цяпер касцёл нагадвае сабой чалавека, у якога вырваны ўсе ўнутранасці.

На адной з вуліц захавалася трафарэтка «Астаноўка трамвая». Яна—помнік трамваю і дакумент, які сведчыць аб нямецкім грабяжы. Немцы вывезлі з Варшавы і рэйкі, трамвайныя вагоны і правады.

Па вялікай, калісьці прыгожай плошчы, стаяў помнік Шапену, сусветна вядомаму польскаму кампазітару. Ад помніка астаўся толькі п'едэстал. На ім вялікі чорны надпіс: «Плошча Адольфа Гітлера». Адзін з жыхароў Прагі, які ішоў разам з намі, са злосцю гаворыць:

— Апагацілі сволачы Варшаву.

На вуліцах зрэдку сустракаюцца жыхары горада. Куды падзелася ўсё насельніцтва? І першы сустрэчны нам гаражанін расказаў аб знішчэнні варшавян. У верасні мінулага года немцы загадалі жыхарам пакінуць горад. Маладых і здаровых яны пагналі ў Германію, а астатніх «эвакуіравалі» амаль голых (з сабой нічога не дазвалялася браць). Велізарны горад аказаўся без жыхароў. Немцы бесперашкодна грабілі кватэры, палілі і ўзрывалі дамы. І так прадаўжалася да таго дня, пакуль Чырвоная Армія не выбіла немцаў з горада. Аб тым, што зрабілі немцы з горадам, красамоўна сведчыць наступная лічба: больш 90 проц. усіх будынкаў поўнасцю разбураны. Патрэбуецца шмат працы, каб польская сталіца набыла нармальны выгляд.



Развалiны адной з прыгажэйшых у мінулым вуліц Варшавы — Кракаўскае прадмесце.

Фото нашага карэспандэнта Н. Мядзведзева.

Вуліцы паступова ажываюць. У горад вяртаюцца ўцалеўшыя жыхары, якія хаваліся ў навакольных сёлах і мястэчках. Адбываюцца незабыўныя сустрэчы. Казімір Мацюшак тры гады не быў у родным горадзе. Спачатку ён партызаніў, а затым перайшоў лінію фронта і ўступіў у Польскае войска. Плячо ў плячо з байцамі Чырвонай Арміі змагаўся ён за вызваленне Варшавы. І вось ён прышоў да свайго дома. Ад дома асталіся адны руіны. У гэты-ж час сюды прышла пасівелая жанчына. Яна доўга ўглядалася ў абветраны твар польскага салдата, а затым кінулася яму на шыю:

— Казімір!

— Рэгіна!

Гэта была сястра. Яна да верасня мінулага года жыла ў Варшаве. Яе жыццё—гэта жыццё тысяч палякаў, якія трапілі ў нямецкае ярмо. Бацьку і брата немцы расстралялі, маці памёрла з голаду, малодшы брат пакалечаны: нямецкай гранатай яму адарвала руку. Слухаючы расказ сястры, Казімір Мацюшак сціскае кулакі. Ён клянецца адпомсціць нямецкім душагубам за ўсё: за родных і за разбураную Варшаву.

Па вуліцы ідзе патоўп людзей. Уперадзе — прадстаўнікі Часовага Польскага Ўрада. Жыхары Варшавы ведалі аб існаванні свайго ўрада і цяпер расказваюць яго прадстаўнікам аб кашмарных днях нямецкай акупацыі.

Вечарэе. Нашы пантанёры навялі пераправу праз Віслу. У горад хлынулі жыхары Прагі. Яны бачаць усе разбурэнні, зробленыя немцамі. Іх вочы загараюцца гневам, а губы шэпчуць:

— Да помсты!

Так! Польскі народ ніколі не даруе немцам знішчэння яго сталіцы—Варшавы.

Маёр Н. МЯДЗВЕДЗЕЎ.

г. Варшава.

Прапановы рабочых праводзяцца ў жыццё

Доўгі час работа барысаўскага шклозавода імені Дзержынскага тармазілася радам вытворчых непаладкаў. Тут не была правільна арганізавана праца ў цэхах, часта не выконваліся нормы выпрацоўкі асобнымі рабочымі і брыгадамі.

Каб выявіць недахопы, нядаўна на прадпрыемстве былі праведзены вытворчыя сходы рабочых, на якіх намечаны канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне выпуску прадукцыі. Рабочыя ўнеслі рад рацыяналізатарскіх прапаноў.

Рэалізацыя прапаноў дала магчымасць павысіць прадукцыйнасць працы, палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі. Першая прапанова рабочых, якая праведзена ў жыццё—перавод кожнай брыгады абодвух змен працаваць па два прэсы—павялічыла выпуск прадукцыі на 43 і больш процантаў: калі пры рабоце на адным прэсе выпускалася за змену 700 шклянак, то пры рабоце на двух прэсах змена дае 1000 і больш шклянак.

Значную ролю ў павелічэнні прадукцыі і палепшанні яе якасці адыграў абмен вопытам. Майстар стаханавец тав. Сідаровіч кожны дзень праводзіць з шклодувамі практычныя заняткі. Тав. Сідаровіч тлумачыць і паказвае на практыцы, як лепш арганізаваць работу, а потым правярае, як засвоена растлумачанае. Практычныя заняткі дапамаглі рабочым дабіцца высокай прадукцыйнасці працы, асабліва адстаючым. Так, рабочыя Янучкоўскі, Жаварапак да заняткаў выконвалі дзённае заданне на 70 процантаў, а зараз выконваюць на 118 процантаў, а Сідаровіч, Марцінкевіч, Хмара, Лапіцкі і Нагарнюк—на 130 процантаў.

Шырока разгорнутае соцыялістычнае спаборніцтва, якое заключана паміж звеннямі, брыгадамі і індывідуальна паміж рабочымі, дало станоўчыя вынікі. Першая змена, начальнікам якой з'яўляецца тав. Каплан, выконвае дзённае заданне больш як на 120 процантаў.

Вялікая ўвага аддаецца навучанню маладых рабочых. За кароткі час вучобы авалодалі спецыяльнасцямі і працуюць самастойна: Еўгеній Лукін—электраманцёрам, Вера Пашкевіч—слесарам, Іван Казлоўскі — токарам. У хуткім часе яшчэ 10 вучняў будуць пераведзены на самастойную работу.

Адміністрацыя шклозавода штодзённа клапоціцца аб добрабыце рабочых. Палепшылася работа сталовай. Арганізаваны абеды для другой змены. **К. ГЛУШАНІН.**

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 3 лютага. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што ў раёне лесу Моншау пяхотныя часці саюзнікаў, пераадолеўшы нязначнае супраціўленне праціўніка, прасунуліся на адлегласці ад 1.500 да 2.000 ярдаў.

На поўдні часці саюзнікаў прасоўваліся ва ўсходнім напрамку, пераадольваючы перашкоды лініі Зігфрыда; праціўнік сустракаў іх моцным кулямётным і ружэйным агнём. У 5,5 мілі на ўсходзе ад Булінгена занят германскі горад Нейгоф; ва Удэнбрэйтэ прадаўжаюцца жорсткія баі.

Перайшоўшы германскую граніцу на ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Сен-Віта, часці саюзнікаў занялі Ауў і Мютцэніх і, авалодаўшы Гроспангенфальдам, дасягнулі ваколіцы Блейальфа. Хукхусшэйд, які знаходзіцца ў 3 мілях на паўднёвым захадзе ад Хагенау, таксама занят саюзнікамі.

Пяхотныя і танкавыя часці саюзнікаў прарваліся ў цэнтр Кальмара; некаторыя поспехі дасягнуты таксама на ўсходняй і заходняй украінах горада.

Войскі саюзнікаў дасягнулі Рэйна і ўтрымліваюць у сучасны момант заходні бераг Рэйна на працяжэнні прыкладна 35 міль на поўдні ад Страсбурга.

Буйныя злучэнні цяжкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Вісбадэн, Карлсруе і завод сінтэтычнага гаручага ў Ванер-Эйкеле. Лёгкія бамбардыроўшчыкі атакавалі транспартныя аб'екты ў Германіі.

ЛОНДАН, 3 лютага. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ваенныя аперацыі на італьянскім фронце абмяжоўваліся дзеяннямі патрулёў.

НАЛЁТ 1.000 АМЕРЫКАНСКІХ БАМБАРДЫРОЎШЧЫКАЎ НА БЕРЛІН

ЛОНДАН, 3 лютага. (ТАСС). Штаб амерыканскіх ваенна-паветраных сіл на еўрапейскім тэатры аперацый паведаміў, што больш тысячы амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў 3 лютага зрабілі налёт на ваенныя аб'екты ў цэнтры Берліна.

Звыш 400 цяжкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на заводы сінтэтычнага гаручага ў прадмесці Магдэбурга і на сартыровачныя станцыі ў Магдэбургу.

Бамбардыроўшчыкі ішлі ў суправаджэнні больш 900 знішчальнікаў.

ЛОНДАН, 3 лютага. (ТАСС). У Лондане афіцыяльна аб'яўлена, што амерыканскія бамбардыроўшчыкі скінулі 3 лютага на цэнтр Берліна 2.500 тон фугасных і запальваючых бомб.

Становішча ў Берліне

ПРАДАЎЖАЕЦЦА ЭВАКУАЦЫЯ УСТАНОЎ. — УЗБРОЕНЫЯ СУТЫЧКІ НАСЕЛЬНІЦТВА З ПАЛІЦЫЯЙ

ЛОНДАН, 2 лютага. (ТАСС). Як паведамляе газета «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», паводле атрыманых ёю вестак, доўгія калоны грузавікоў, нагружаных архівамі берлінскіх устаноў, хатняй абстаноўкай і другімі рэчамі, прадаўжаюць рухацца ў напрамку на Мюнхен. Эвакуацыя ўрадавых устаноў, якая пачалася 27 студзеня, цяпер у поўным разгары. Прадстаўнікі замежных дзяржаў таксама будуць пераведзены ў Мюнхен. Усе грамадскія будынкі, гасцініцы і прыватныя асабнякі ў Мюнхене, якія не пашкоджаны ад бамбардыровак, рэквізіраваны.

У Берліне штодзень адбываюцца сутычкі, якія выкліканы вострым недахватам прадуктаў харчавання. Узброеныя жыхары горада ўступаюць у сутычкі з паліцыяй. Адна з такіх сутычак адбылася 28 студзеня ў рабочым раёне Нейкельн. У часе дэманстрацыі, калі галоднае насельніцтва патрабавала ежы, паліцыя правяла шматлікія арышты. Калі дэманстранты паспрабавалі вызваліць арыштаваных, паліцыя пачала страляць у натоўп і забіла 4 чалавекі. У адказ на гэта з натоўпу раздаліся выстралы. Частка паліцэйскіх была забіта.

Берлінская паліцыя адкрыла таксама стральбу па натоўпу галодных жанчын, якія захапілі грузавік з бульбай. 37 жанчын было забіта. 30 студзеня бежанцы раскласлі касцёр з садовых лавак, прабуючы сагрэцца, яны апракідвалі і палілі трамваі. На гэты раз паліцэйскія не ўмешваліся.

СТАНОВІШЧА Ў ГЕРМАНІІ

СТАКГОЛЬМ, 2 лютага. (ТАСС). Шведы, якія прыбываюць з Германіі, расказваюць аб паніцы і прыгнечаным настроі ва ўсіх гарадах Германіі. Прыехаўшыя сюды з Берліна асобы паведамляюць, што атрады фольксштурма ў сучасны момант заняты мініраваннем будынкаў ва ўсходняй частцы Берліна.

Дзеці, эвакуіраваныя раней з Берліна на ўсход, цяпер адпраўляюцца ў Саксонію. Вуліцы больш не ачышчаюцца ад снегу, і аўтамашыны амаль не ходзяць. Трамвайны рух падтрымліваецца з цяжкасцю. У Берліне адчуваецца востры недахоп хлеба і бульбы. Харчовае становішча абвастраецца з кожным днём.

Газета «Свенска Дагбладэт» перадае: «31 студзеня ў Берне былі атрыманы паведамленні з Германіі адносна растучага непакою ў вялікіх гарадах Германіі. Ва Усходняй Германіі, у раёне паміж Дрэздэнам і Брэслау, мелі месца бунты ў атрадах фольксштурма. У Гамбургу і Брэмене таксама пануюць панічныя настроі. Кожную ноч на сценах дамоў паяўляюцца антыгітлераўскія лістоўкі».

* * *

ЛОНДАН, 3 лютага. (ТАСС). Лонданскае радыё, спасылаючыся на дыпламатычных прадстаўнікоў нейтральных краін, перадае, што з паўночных і ўсходніх раёнаў Германіі ў Берлін прадаўжаюць прыбываць патокі бежанцаў. Колькасць іх павялічваецца з кожным днём. На вуліцах Берліна можна бачыць масу жанчын і дзяцей, якія ходзяць з дома ў дом і просяць міласты ню. У сувязі з масавай эвакуацыяй адміністратыўныя органы ў гарадах Усходняй Германіі спыняюць усякую дзейнасць. Уладу ў гэтых гарадах ажыццяўляюць гестапаўцы. Гітлераўскія салдаты грабяць маёмасць эвакуіраваных. Ваенныя ўлады вымушаны былі выдаць загад, у якім гаворыцца, што за грабёж маёмасці салдаты будуць падвяргацца самым суровым пакаранням.

БАІ Ў ЮГАСЛАВІІ

БЕЛГРАД, 3 лютага. (ТАСС). У паведамленні вярхоўнага штаба Народна-Вызваленчай арміі Югаславіі гаворыцца, што пасля шматдзённых баёў у сектары Віелін югаслаўскія часці занялі Брэзава Поле, перарваўшы тым самым сувязь паміж нямецкімі апорнымі пунктамі Брачко-Віеліна. Вораг страціў толькі забітымі 550 салдат і афіцэраў. Захоплена вялікая колькасць зброі і ваенных матэрыялаў. У сектары Брачко рассеяна варожая калонна, якая прабавала прабіцца да Чэліна.

У сектары Власеніца — Дрыняча прадаўжаліся цяжкія баі.

СУДЫ НАД БАЛГАРСКІМІ ВАЕННЫМІ ЗЛАЧЫНЦАМІ

САФІЯ, 3 лютага. (ТАСС). Сафійскае радыё паведамляе аб судах над балгарскімі ваеннымі злачынцамі ў гарадах Враца, Горна-Орэховіцэ, Слівен. Усюды адбываюцца масавыя мітынгі, удзельнікі якіх патрабуюць суровага пакарання фашысцкіх злачынцаў. У Горна-Орэховіцэ ў сувязі з працэсам адкрыта антыфашысцкая выстаўка, на якой пабывалі тысячы жыхароў горада і навакольных сёл.

ПРЫЕМ У ХЕЛЬСІНКІ У ЧЭСЦЬ СОВЕЦКІХ ДЗЕЯЧОЎ НАВУКІ І МАСТАЦТВА

ХЕЛЬСІНКІ, 1 лютага. (ТАСС). 29 студзеня фінскі міністр асветы Такі наладзіў прыём у чэсць совецкіх прадстаўнікоў навукі і мастацтва — прафесара Александрава, старшыні ВОКС Каменева, кінарэжысёра Пудоўкіна, пісьменніка Леонава, прафесара Маліноўскага, мастакоў Купрыянава, Крылова і Сокалава (Кукрыніксы) і кампазітара Кабалеўскага. На прыёме прысутнічалі міністры Энкель, Пекала, Кеконе, Лейно і Хело, а таксама прадстаўнікі Саюзнай Кантрольнай Камісіі на чале з тав. Орловым. У той-жа дзень адбыўся абед, наладжаны фінскімі пісьменнікамі, мастакамі і дзеячамі кіно. У прамовах падкрэслівалася значэнне культурных сувязей паміж абодвума краінамі.

АДСТАЎКА БЕЛЬГІЙСКАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 2 лютага. (ТАСС). Агенцтва Франс Прэс перадае, што бельгійскі прэмер-міністр Пэрло ўручыў сёння прынцу-рэгенту Шарлю заяву аб адстаўцы ўрада.

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

Міжнародны агляд

За прайшоўшы тыдзень увага ўсяго свету па-ранейшаму была прыкавана да гіганцкага наступлення Чырвонай Арміі, якая прадаўжае развіваць свае аперацыі з нябачанай яшчэ ў гісторыі імклівасцю і сілай. Ужо ў першыя два тыдні наступлення совецкія войскі знішчылі і ўзялі ў палон амаль 400.000 гітлераўцаў, а таксама захапілі багатыя трафеі. У выніку трохтыднёвых баёў карэнным чынам змянілася абстаноўка на фронце. Чырвоная Армія адрэзала Усходнюю Прусію ад астатняй Германіі, уторглася ў Верхнюю Сілезію, у Памеранію і Брандэнбург. Зараз нашы войскі знаходзяцца на подступах да Франкфурта на Одэры, які знаходзіцца менш чым у 70 кілометрах ад сталіцы фашысцкага логава — Берліна. Наступленне Чырвонай Арміі, піша канадская газета «Трыбюн», паставіла Германію перад тварам паражэння.

Прадаўжаючы наступленне шырокім фронтам, совецкія войскі прасоўваюцца ўсё далей у глыб Германіі, займаючы сотні нямецкіх гарадоў і тысячы іншых населеных пунктаў. Германія страціла найбагацейшыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя раёны, якія адыгрывалі буйную ролю ў яе ваенным патэнцыяле. Адзін з германскіх арсеналаў, які знаходзіўся ва ўсходніх раёнах краіны, перастаў забяспечваць гітлераўскую ваенную машыну важнейшымі відамі ўзбраення і сыравіны.

Перамогі Чырвонай Арміі з'яўляюцца тым больш велічнымі, што ёй на кожным кроку прыходзіцца пераадольваць не толькі доўгачасовыя ўмацаванні, але і мець справу з ярасным супраціўленнем праціўніка.

Многія газеты саюзных і нейтральных краін, каментыруючы бліскучыя аперацыі Чырвонай Арміі, якія прымусілі гітлераўцаў прыбегнуць да ўзмоцненай перакідкі сваіх войск з Заходняга па Усходні фронт, падкрэсліваюць, што цяпер створаны выключна спрыяючыя ўмовы для наступлення на Захадзе.

Газета «Нью-Йорк геральд трыбюн», паведамляючы аб перакідцы германскіх войск з Захада на Усход, піша «Гэта адкрывае вялікія магчымасці арміям, якія знаходзяцца пад камандаваннем генерала Эйзенхаўэра». Англійская газета «Дэйлі экспрэс» выказвае здзіўленне з поваду таго, што «саюзныя войскі не рынуліся ў пустыя абшары», якія ўтварыліся ў выніку знясення з Заходняга фронта многіх германскіх дывізій.

* * *

Імклівае наступленне Чырвонай Арміі выклікала сумяшчу і неапісуемую паніку ў гітлераўскай Германіі. Гэтаму, між тым, не прыходзіцца здзіўляцца, калі ўлічыць, што яшчэ зусім нядаўна, у снежні і нават у пачатку студзеня, гітлераўскі друк і радыё былі запоўнены пераможнымі рэляцыямі аб пераломе, які нібыта наступіў на Заходнім фронце і хуткім германскім наступленні на Усходнім фронце. Газета «Фелькішэр бобахтэр» пісала тады аб намеры Германіі «дыктаваць закон дзеяння». Цяпер гітлераўцы ўжо гавораць аб «крытычным становішчы», у якім апынулася Германія, аб тым, што «на карту пастаўлена ўсё, што ёсць у немцаў». Гітлераўскае агенцтва Трансоцэан з сумам прызнае: «Нам прадстаіць убачыць новыя адступленні германскай арміі... Мы не павінны рабіць ілюзій».

Вышэйшыя германскія саноўнікі ўцякаюць з Берліна ў Мюнхен і іншыя гарады. Са сталіцы эвакуіраваны многія міністэрствы, прадаўжаецца эвакуацыя шматлікіх арганізацый і ўстаноў. Мільёны бежанцаў ствараюць заторы на транспарце, паязды бяруцца прыступам, дарогі забіты бежанцамі. Вельмі сімптоматычным з'яўляецца апошні артыкул Гебельса ў «Дас рэйх», у якім ён вымушан прызнаць, што «развіццё падзей на Усходзе набыло драматычны характар... Нямецкі народ, пакінуты амаль усімі сваімі саюзнікамі ў Еўропе, стаіць па адзінокім пасту»...

* * *

Па меры набліжэння канчатковага разгрому гітлераўскай Германіі друк і грамадскасць дэмакратычных краін усё больш удзяляе ўвагі пытанню аб прыцягненні да адказнасці ваенных злачынцаў, іх пакаранні і прысячэнні падрыўной дзейнасці гітлераўскай агентуры ва ўсіх яе розных адносінах. У гэтай сувязі вельмі павучальным з'яўляецца працэс над галоўнымі спадручнымі Гітлера ў Балгарыі, які гэтымі днямі закончыўся ў Сафіі. Падзеі прыцягваюць тым большую ўвагу, што гэта, па сутнасці справы, першы буйны працэс супроць злачынцаў цяперашняй вайны.

Перад балгарскім народным судом прадсталі главары, якія чынілі, разам з гітлераўцамі, жудасныя злачынствы ў Балгарыі. Гэта — былыя рэгенты, міністры, царскія саветнікі, дэпутаты так званага «парламента», у якім панавалі фашысты. Ва ўгоду гітлераўскай Германіі яны не спыняліся ні перад чым. Яны ўсадзілі нож у спіну югаслаўскага і грэчаскага народаў, паслаўшы супроць іх экспедыцыйныя войскі. Яны аб'явілі вайну Англіі і Амерыцы, сістэматычна выступалі з правакацыямі супроць Совецкага Саюза, старанна рыхтуючыся да вайны з совецкім народам. Разам з гітлераўскімі разбойнікамі яны грабілі балгарскі народ, вынішчалі лепшых яго прадстаўнікоў, — актыўных удзельнікаў барацьбы супроць фашысцкага гвалтаўніцтва.

Суд, які прадаўжаўся звыш месяца, ускрыў агідныя злачынствы ўсёй гэтай шайкі гітлераўскіх агентаў.

Суд прыгаварыў галоўных ваенных злачынцаў да расстрэла і канфіскацыі маёмасці. Частка абвінавачаных прыгаворана да пажыццёвага турэмнага зняволення або іншых мер пакарання. Увесь балгарскі народ успрыняў гэтае рашэнне з глыбокім задавальненнем. Аб гэтым сведчаць многалюдныя мітынгі, якія горача адабраюць рашэнне суда і патрабуюць роспіску і прыцягнення да адказнасці ўсіх злачынцаў, якія яшчэ хаваюцца. Прыгавор балгарскага народнага суда ў Сафіі, бясспрэчна, таксама будзе сустрэт з задавальненнем народамі ўсіх дэмакратычных краін, якія змагаюцца за разгром гітлераўскай Германіі і поўнае выкараненне фашысцкай погані.

* * *

Як вядома, пад даўленнем рэакцыйных саветнікаў югаслаўскі кароль Пётр выступіў супроць заключанага паміж маршалам Тіто і главой югаслаўскага ўрада Шубашычам пагаднення, прысвечанага пытанням дзяржаўнага ўпарадкавання Югаславіі. Як вядома, гэтае пагадненне было адобрана дэмакратычнай грамадскасцю ў Югаславіі. Пасля шматлікіх мітынгаў і дэманстрацый, на якіх югаслаўскі народ асудзіў дзеянні караля, а таксама пасля крытыкі па яго адрасу ў многіх саюзных краінах, кароль палічыў неабходным адмовіцца ад занятай пазіцыі. Услед за чыста фармальнай адстаўкай Шубашыча, апошняму кароль тут-жа даручыў фарміраванне новага ўрада і адобрыў рашэнне аб стварэнні рэгенцкага совета. Ён падпісаў таксама дэкларацыю аб перадачы каралеўскай улады рэгенцкаму совету да таго часу, пакуль канстытуцыйная асамблея не прыме адпаведнага рашэння. Гэтае рашэнне караля было адобрана ўрадам. Такім чынам, як відаць, правалілася спроба рэакцыі саштурхнуць Югаславію з дэмакратычнага шляху.

І. ЛАПІЦКІ.

ТЭАТРЫ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР імені ЯНКІ КУПАЛЫ

4 лютага «ПОЗНЯЕ КАХАННЕ»

6, 7 і 9 лютага

К. КРАПІВА, лаўрэат Сталінскай прэміі

„Хто смяецца апошнім"

Камедыя ў трох дзеях.

Пачатак у 19 гадзін.

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета ў памяшканні Дома Чырвонай Арміі

4 лютага — «А Л Е С Я».

Пачатак у 19 гадзін 30 мінут.

Кінотэатр «Першы» «ПЕСНЯ АБ РАСІІ»

Кінотэатр «Беларусь» «БЕСПАСАЖНІЦА»

Пачатак сеансаў у 16, 18, 20 і 22 гадзіны

Кінотэатр «Радзіма» «АРСЕН»

Мінскі абласны аддзел народнай асветы

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР НА 6-МЕСЯЧНЫЯ ПЕДАГАГІЧНЫЯ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ ШКОЛ

Курсы будуць працаваць у гарадах: Барысаве, Чэрвені і Уздзе.

Прымаюцца грамадзяне, якія маюць адукацыю ў аб'ёме 7 класаў сярэдняй школы.

Адрас для падачы заяў: г. Барысаў, дырэктару педвучылішча, Чэрвеньскі райана, Уздзенскі райана.

Пачатак заняткаў 10 лютага.

Мінаблана.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

ў горадзе Мінску

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР

НА ЧАТЫРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ КРЭДЫТНЫХ ІНСПЕКТАРАЎ І БУХГАЛТАРАЎ.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 300 рублёў у месяц, а іншагародняя—інтэрнатам. Паступаючыя на курсы павінны мець адукацыю не ніжэй 7 класаў, даведку з месца работы, пашпарт і ваенны білет—для ваеннаабавязаных.

На курсы прымаюцца асобы не маладзей 17 год.

Пачатак заняткаў 5 лютага

АТ 29746

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.